Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

25 ЖНІЎНЯ 2007 г. СУБОТА

№ 159 (26024)

Кошт 380 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

## СПЯКОТА АДСТУПІЦЬ?

**Заходнія вятры з боку Еўропы гэтымі днямі прынясуць на тэрыторыю Беларусі больш свежае паветра, таму на выхадныя трапічная спякота пачне крыху слабець, — паведаміла карэспандэнту «Звязды» галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Вольга Фядотава.**

У суботу ў другой палове дня ў паўночнай частцы краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Тэмпература паветра 23—29, у Гомельскай вобласці — да 30 градусаў.

У нядзелю непрацяглыя дажджы чакаюцца па паўночнаму захаду краіны. Тэмпература паветра ўначы 11—17, удзень 18—23, у Брэсцкай і Гомельскай абласцях — да 26 градусаў.

Згодна з папярэднімі прагнозамі, на наступным тыдні чакаецца ўмерана цёплае надвор'е, а ў сярэдзіне тыдня тэмпература паветра ўначы панізіцца да 8—13, удзень — да 14—20 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**



## ПРОНІНЫ ПЕРАПРАВЫ



Рака Проня, Чавускі раён.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### ЗА НЕЗАКОННАЕ ПАЛЯВАННЕ — КРЫМІНАЛЬНАЯ СПРАВА

**Работнікамі Быхаўскай прыродаахоўнай міжрайінспекцыі сумесна з супрацоўнікамі Быхаўскага РАУС паблізу вёскі Гадылёва былі затрыманы чатыры чалавекі, якія без дазвольных дакументаў у забароненыя для палявання тэрміны здабылі лася і чатырох зайцаў.**

Канфіскаванае мяса лася вагой 160 кілаграмаў і зайцаў вагой 13 кілаграмаў перададзена ў зверагаспадарку. Паколькі прыродным рэсурсам быў нанесены ўрон у асабліва буйным памеры (135 базавых велічынь), на месца выклікалася следча-аператыўная група мясцовага РАУС. Супрацоўнікі міліцыі канфіскавалі фару з правадамі, тры зарэгістраваныя і адно незарэгістраванае паляўнічыя ружжы, боепрыпасы да іх. Легкавы аўтамабіль ВАЗ-2121, які належаў аднаму з затрыманых, дастаўлены ў райаддзел міліцыі. У дачыненні да чацвёркі разглядаецца пытанне аб узбуджэнні крымінальнай справы.

Крыху раней работнікамі ўжо Касцюковіцкай міжрайінспекцыі сумесна з супрацоўнікамі Краснапольскай раённай арганізацыі РДГА «БТПР» каля вёскі Казелле Краснапольскага раёна быў затрыманы ляснік Новаяльнянскага лясніцтва ДЛГУ «Краснапольскі лясгас». Апошні сумесна з непаўналетнім жыхаром Украіны незаконна паляваў забароненым спосабам (з выкарыстаннем транспартнага сродку з уключаным рухавіком), з незарэгістраваным ружжом, без дакументаў на права палявання. Пры затрыманні спрабаваў уцячы. Зараз разглядаецца пытанне аб узбуджэнні крымінальнай справы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### РАКАВАЯ СУСТРЭЧА

**Паблізу вёскі Заполле, што ў Рагачоўскім раёне, людзі знайшлі целы двух няшчасных: 37- і 35-гадовыя мужчыны атрымалі смяротны разрад токам.**

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама, загінулымі аказаліся мясцовы жыхар і вясковец з Глускага раёна. Апошні гасцяваў у сябра, з якім пазнаёміўся ў лячэбна-працоўным прафілакторыі ў Светлагорску, дзе абодва праходзілі курс лячэння. Як яны бавілі час, каму першаму прыйшла ідэя разжыцца на крадзяжы правадоў з лініі электраперадач — невядома, толькі скончылася ўсё для абодвух трагічна. Прыхапіўшы з сабой вяроўку з крукам, мужчыны накіраваліся да лініі электраперадачы. Апынуўшыся на месцы, адзін з іх закінуў крук на правады: у выніку смяротны разрад ударыў яго ў плечы, а другога небараку, што стаяў побач, — у калена.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### УЧОРА АД АБЕЛІСКА «МІНСК — ГОРАД-ГЕРОЙ» СТАРТАВАЎ ТРЭЦІ БЕЛАРУСКІ АЎТАКРУІЗ



Фота Вольгі ЛАСКА.

Як і два папярэднія, сёлетні прабег прысвечаны развіццю аўтатурызму ў Беларусі. І пройдзе ён сярод помнікаў, якія з'яўляюцца гістарычнай і культурнай спадчынай краіны — замкаў, палацаў, праваслаўных і каталіцкіх храмаў. За два дні калона з двух дзесяткаў сучасных аўто праедзе амаль тысячу кіламетраў па трасах Мінскай, Гродзенскай абласцей і завершыць свой шлях у цытадэлі гераізму і мужнасці — Брэсцкай крэпасці.

***На здымку: удзельнікі сёлетняга аўтакруізу.***

А на мой погляд...

## ДАЙ НАМ УСІМ, БОЖА, МЕНШ РЫЗЫКІ Ў ЖЫЦЦІ

**Тэма спёкі зараз, бадай, самая актуальная. Усе толькі і абмяркоўваюць, што гарачыню ды спосабы паратунку ад яе.**

**А ў якую «гарачую» сітуацыю ў жыцці даводзілася трапляць вам?**



Фота БЕЛТА.

***Васіль ЧЭКАН, начальнік Віцебскага абласнога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях:***

— Калі гаварыць найперш пра службу, то былі, канешне, такія сітуацыі. І раней, калі займаў ніжэйшыя пасады, і зараз: пажары, аварыі... З апошніх падзей магу прыгадаць пажары на «Нафтане», ільнозаводзе, разрыў трубаправода. Шчыра кажучы, успамінаць нейкія падрабязнасці не хацелася б, хоць ёсць што прыгадаць па кожнаму выпадку. А ўвогуле — такая ў нас праца.

***Дзмітрый САЛАДУХІН, галоўны дзяржаўны падатковы інспектар аддзела вылічэння маёмасных падаткаў, дэкларавання даходаў і маёмасці Міністэрства па падатках і зборах:***

— У мяне ўсе гарачыя сітуацыі ў жыцці, напэўна, звязаны толькі з працай: куды які ліст накіраваць, у які тэрмін. Усе думкі выключна пра работу, ні пра што іншае прыгадаць зараз не магу.

***Уладзімір ЗУБКО, начальнік упраўлення па папярэджанню правапарушэнняў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь:***

— У маладосці быў выпадак — на мяне кінуўся паранены лось. Вельмі небяспечная, стрэсавая сітуацыя была. Я, можна сказаць, цудам застаўся жывым. На шчасце, больш падобных выпадкаў у жыцці не было. Браканьеры? Асабіста на мяне яны зброю не настаўлялі, не пагражалі, хаця такія выпадкі і былі: два гады таму, напрыклад, ад рук браканьераў загінуў інспектар...

***Віктар ДУБАРЭНКА, намеснік дырэктара па якасці Мінскага домабудаўнічага камбіната:***

— Бязвыхадных сітуацый, на шчасце не было. Хаця на працы часам бывае сапраўды горача. Калі гаварыць пра асабістае жыццё, дык некалі ў вёсцы быў выпадак: заўважыў пажар, кінуўся насіць вёдры з вадой, заліваць полымя...

***Аляксандр МЯТЛА, старшыня Дабрачыннага фонду дапамогі воінам-інтэрнацыяналістам «Памяць Афгана»:***

— Памятаю спёку ў Афганістане, калі тэмпература ў цяні дасягала 45 градусаў, а пясок награваўся да 60—70 градусаў, так што басанож стаяць на ім было немагчыма, толькі чачотку адбіваць (*смяецца*). Браня награвалася так, што на ёй можна было пячы яешню без патэльні. Уяві, калі ў такіх умовах даводзілася яшчэ і бой весці. Памятаю, якраз летам 1987 года прыкладна ў такіх умовах суправаджалі калону ў бок Кандагара. Я на «Урале» наскочыў на міну, атрымаў кантузію, месяц у шпіталі давялося праляжаць...

***Уладзімір СІДАР, індывідуальны прадпрымальнік, г. Шчучын:***

— У мяне ў асноўным гарачыя сітуацыі здараюцца на дарозе. Бывае, «падрэжа» цябе які вадзіцель так, што не ведаеш, куды падзецца. Хаця апошнім часам, трэба зазначыць, парадку тут стала больш. Нядаўна ездзіў ва Украіну, у Адэсу, праехаў тры тысячы кіламетраў, дык на дарогах, асабліва ў нашай краіне, была даволі спакойная абстаноўка. Хаця я ў прынцыпе заўсёды саступаю дарогу, бо калі чалавек захоча, ён усё роўна цябе абгоніць — не цяпер, дык пазней. А яшчэ, лічу, вельмі шмат правоў у пешаходаў. З-за іх абыякавасці, безадказнасці таксама даводзіцца часам нервавацца.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

Шануй сваё!

## НАЗВАЦЬ ІМЯ НЕВЯДОМАЙ І АДКРЫЦЬ ТОЕ, ЧАГО НЕ БАЧЫЛІ

**Такую мэту паставіў Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі, стварыўшы інтрыгуючую экспазіцыю «Беларусь XVI—XVIII стагоддзяў у партрэтах і геральдыцы».**

Адна з яе інтрыг: выстава раскрывае імя асобы, якая намалявана на невялічкім партрэце, што захоўваецца ў калекцыі музея. Немаладая жанчына ў карункавым чапцы з двума ордэнскімі ўзнагародамі. Ён значыўся як «Партрэт Невядомай» больш за семдзесят гадоў. Але ў 2005 годзе таямніца была раскрыта: гэта Луіза, жонка Антонія Радзівіла, кампазітара і дзяржаўнага дзеяча. У жонкі прадстаўнік магнацкага роду абраў прынцэсу прускую — Луіза Радзівіл паходзіла з роду Гогенцолернаў. Цяпер яна глядзіць з мінуўшчыны пад сваім сапраўдным імем. Гэты партрэт выстаўляецца ўпершыню, як і некаторыя іншыя партрэты знакамітых асобаў, якія пакінулі след у жыцці Беларусі, вызначаючы палітыку краіны, яе грамадскі і духоўны шлях.

Своеасаблівыя галерэі ў экспазіцыі знаёмяць асобна з дзяржаўнымі дзеячамі, асобамі, якія прысвяцілі сябе Богу, прадстаўнікамі шляхты. Род Радзівілаў прадстаўлены асобна, так жа як і род Завішаў. І каб было прасцей зразумець, хто каму і кім даводзіўся, змяшчаюцца радаводы з улікам найноўшых даследаванняў. А спецыяльныя каментарыі спецыялістаў дапамогуць зразумець, у якіх няпростых варунках маглі апынуцца гэтыя людзі, як і чаму іх жыццё склалася менавіта так, а не інакш, і якім чынам яны паўплывалі на лёс краіны, што дасталася нам у спадчыну.

Гэтая экспазіцыя не ўзнікла на пустым месцы. Музей да яе рыхтаваўся на працягу апошніх гадоў — усё пачалося са сціплай выставы ў 2001 годзе «Твары нашай гісторыі». Потым яе працягам стала агульнанацыянальная выстава, дзе гістарычныя партрэты можна было ўспрымаць адначасова і як сведчанне гісторыі, і як творы мастацтва. Вынікам гэтага стала цяперашняя экспазіцыя, усе экспанаты якой знаходзяцца ў зборы Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі. У тым ліку і тыя, якія прадстаўляюць старадаўнюю геральдыку Беларусі.

І тут раскрываюцца новыя інтрыгуючыя факты. Даследчыкі сцвярджаюць: геральдычныя праблемы нідзе ў свеце не хвалявалі так душы людзей, як у Рэчы Паспалітай, у склад якой уваходзілі землі цяперашняй Беларусі. І гэта зразумела: федэратыўная дзяржава аб'ядноўвала многа народаў. Але быў у гісторыі некаторых беларускіх тэрыторый малавядомы факт: Случчына і Капыльшчына на працягу амаль 50 гадоў (з 1695 года) адносіліся да нямецкага княства Нойбург у межах нашай краіны. Пра гэта сведчаць дакументы з геральдычнымі пячаткамі Людвікі Караліны Радзівіл і яе мужа Карла Філіпа, палаціна Рэйнскага. Гэтыя землі потым дасталіся ў спадчыну іх дачцэ Эльжбеце Аўгусце. Стагоддзі адкрываюцца нам праз рэчы і імёны людзей, якім яны належалі. Напрыклад, упершыню ў экспазіцыі змешчаны дакументы, на якіх стаяць пячаткі і подпісы каралёў і вялікіх князёў — Жыгімонта Аўгуста, Стэфана Баторыя, Яна Сабескага, асобаў, якія паўплывалі на ход гісторыі краіны.

Сімвалам няпростых часоў для краіны можна лічыць калекцыі зброі, якія таксама прадстаўлены ў экспазіцыі. Ёсць нават рарытэтныя ўзоры халоднай і агнястрэльнай зброі. Але вайна і мір заўсёды ішлі поруч. Калі хтосьці трымаў зброю, каб абараняць сваю зямлю, то хтосьці тым часам дбаў пра тое, каб яе ўзбагаціць, ствараў тут мануфактуры. І можна захапіцца вытанчанымі шклянымі келіхамі і вырабамі з фарфору. Усе старадаўнія рэчы дапаўняюць сучасныя творы прыкладнога мастацтва, якія сведчаць і пра пераемнасць традыцый, і пра захапленне стваральнікаў загадкавай даўнінай, якая вызначыла наш сённяшні дзень.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## Беларусь будзе ажыццяўляць візавыя абмежаванні ў адносінах да афіцыйных асобаў ЗША

**Гэта будзе адказ на «недружалюбны крок» ЗША, якія нядаўна ўвялі новыя візавыя абмежаванні для беларускіх чыноўнікаў. Аб гэтым паведаміла намеснік начальніка ўпраўлення інфармацыі — начальнік аддзела прэс-службы МЗС Рэспублікі Беларусь Марыя Ваньшына.**

3 жніўня Дзяржддэпартамент ЗША выдаў распараджэнне, якое ўдакладняе катэгорыі асобаў, чые звароты па візы аўтаматычна становяцца аб'ектам спецыяльнага разгляду, як таго патрабуе Пракламацыя 8015 прэзідэнта ЗША. Пракламацыя, выдадзеная 15 мая 2006 года, прыпыняе ўезд у Злучаныя Штаты па іміграцыйных ці неіміграцыйных візах асобаў, адказных за палітыку альбо дзеянні, «што пагражаюць працэсу пераходу да дэмакратыі ў Беларусі». Паводле слоў Марыі Ваньшынай, гэтыя аднабаковыя дзеянні ЗША «на справе абмяжоўваюць кантакты паміж дзвюма краінамі, не садзейнічаюць дасягненню ўзаемаразумення і развіццю двухбаковых адносінаў».

Пры гэтым Беларусь захоўвае «прынцыповую пазіцыю аб адкрытасці да ўзаемапаважлівага і раўнапраўнага дыялогу з ЗША». Аднак ва ўмовах «негатыўных аднабаковых дзеянняў» амерыканскіх уладаў краіна вымушана прыняць адэкватныя меры, — заявіла Марыя Ваньшына. Яна дадала таксама, што меры ў адказ з боку Беларусі «ні ў якім разе не адаб'юцца на чалавечых кантактах паміж беларусамі і амерыканцамі». «Больш за тое, МЗС Рэспублікі Беларусь у якасці прыкладу для амерыканскіх калег зробіць больш простым у аднабаковым парадку афармленне беларускіх віз грамадзянам ЗША для ўезду з гасцявымі і дзелавымі мэтамі... Пасля выканання неабходных унутрыдзяржаўных працэдур будзе ўсталяваны парадак, згодна з якім візы на ўезд з памянёнымі мэтамі на тэрмін да 30 дзён грамадзянам ЗША, як правіла, будуць афармляцца без запрашэнняў і на падставе толькі запоўненых візавых анкет». Беларускі бок называе згаданае спрашчэнне афармлення віз актам добрай волі, які пацвярджае дружалюбны характар беларускай знешняй палітыкі.

**Сяргей КУЗНЯЦОЎ.**

### МІНСК-СІЦІ СКРОЗЬ ДВА ФОКУСЫ

Грамадскі і дзелавы цэнтр Мінск-Сіці размесціцца на дзвюх пляцоўках. Цэнтральная, у выглядзе платформы, пройдзе ўздоўж галоўнай транспартнай артэрыі цэнтра (вуліцы Жукоўскага). Галоўнай асаблівасцю пляцоўкі стане адміністрацыйны будынак вышынёй 60—80 паверхаў. Побач з ім пабудуюць кангрэс-хол, гасцініцы, банкі. Другая пляцоўка «прапішацца» на скрыжаванні вуліц Казінца і Чкалава. У гэтай частцы Мінск-Сіці вырасце будынак у 50 паверхаў, каля якога ўзвядуць гандлёвы цэнтр. Паводле задумы архітэктараў некаторыя старыя адміністрацыйныя аб'екты, якія сёння знаходзяцца на гэтай тэрыторыі, застануцца на сваіх месцах.

**Наталля ЛАЗАРАВА,** *«Мінск-Навіны».*

## Фальсіфікаванае паліва «БелАЗаў»

**Удзельнікі арганізаванай злачыннай групы на працягу 2005—2006 гадоў пад выглядам дызельнага паліва пастаўлялі 13 дзяржаўным прадпрыемствам Віцебшчыны больш таннае пячное, рэактыўнае паліва і газу і іх сумесь. У выніку гэтай дзейнасці скралі грашовыя сродкі на суму 1 млрд 790 млн беларускіх рублёў.**

Як паведамілі «Звяздзе» афіцыйныя прадстаўнікі следчага ўпраўлення папярэдняга расследавання УУС Віцебскага аблвыканкама і ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй па Віцебскай вобласці, зараз крымінальная справа (32 тамы!) перададзена ў суд.

Перад законам будуць адказваць 2 арганізатары і «актывісты» злачыннай групы. Адзін з іх, дарэчы, кіраваў віцебскай арганізацыяй адной з партый. Да суда прыцягнуты таксама перавозчык. Крымінальны Кодэкс прадугледжвае пакаранне за такую дзейнасць на тэрмін ад 5 да 12 гадоў.

Цікава, што фірма мела адпаведны дазвол на пастаўку паліва. На законных умовах махляры куплялі больш таннае паліва, што захоўвалі «на базах» у Лепелі і Оршы. Следчым яны прызналіся, што рабілі паліўныя сумесі. Пастаўлялі прадукцыю і на знакамітае прадпрыемства «Даламіт», у кар'ерах якога працуюць магутныя «БелАЗы». Гэтыя гіганцкія аўто запраўляліся фальсіфікаваным палівам, у выніку чаго, зразумела, былі сур'ёзныя збоі ў іх рабоце. Таму перыядычна машыны прыходзілася рамантаваць.

Злачынцы, калі, канешне, такімі іх прызнае суд, таксама займаліся легалізацыяй незаконна атрыманых грошай. Яны накіроўвалі іх на развіццё прадпрыемства. Праз Інтэрнэт куплялі дарагія амерыканскія аўтамабілі, якія потым перапрадавалі.

Цікава, што, паводле слоў прадстаўнікоў праваахоўных органаў, кіраўнікі прадпрыемстваў, якія закуплялі фальсіфікаванае паліва, нават не хацелі прызнаць гэты факт. Маўляў, куплялі ўсё афіцыйна, праблем асаблівых не было. У адносінах да іх адпраўлены адпаведныя прадстаўленні ў Віцебскі аблвыканкам.

Між іншым, яшчэ адзін пастаўшчык нелегальнага паліва — індывідуальны прадпрымальнік, які «папаўся» раней, асуджаны на 3 гады. Ён таксама падманваў прадпрыемствы пры пастаўцы паліва...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ОАО «Паритетбанк» (продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости» (организатор аукциона)

проводят открытый аукцион по продаже помещений транспортного назначения (машиномест) в подземной гостевой автостоянке, расположенных по адресу: г. Минск, ул. Гамарника, 9/3.

| Номер лота | Номер машиноместа | Общая площадь, кв. м | Начальная цена, бел. рубли | Сумма задатка, бел. рубли |
|---|---|---|---|---|
| 1. | 1. | 12.8 | 30 476 160 | 3 047 616 |
| 2. | 2. | 11.9 | 28 333 305 | 2 833 331 |
| 3. | 3. | 11.9 | 28 333 305 | 2 833 331 |
| 4. | 4. | 11.9 | 28 333 305 | 2 833 331 |
| 5. | 5. | 11.9 | 28 333 305 | 2 833 331 |
| 6. | 6. | 12.0 | 28 571 400 | 2 857 140 |
| 7. | 7. | 12.0 | 28 571 400 | 2 857 140 |
| 8. | 9. | 12.2 | 29 047 590 | 2 904 759 |
| 9. | 13. | 12.2 | 29 047 590 | 2 904 759 |
| 10. | 16. | 12.5 | 29 761 875 | 2 976 188 |
| 11. | 17. | 12.5 | 29 761 875 | 2 976 188 |
| 12. | 20. | 12.5 | 29 761 875 | 2 976 188 |
| 13. | 21. | 12.5 | 29 761 875 | 2 976 188 |
| 14. | 22. | 12.5 | 29 761 875 | 2 976 188 |
| 15. | 27. | 12.5 | 29 761 875 | 2 976 188 |
| 16. | 28. | 12.5 | 29 761 875 | 2 976 188 |
| 17. | 29. | 11.7 | 27 857 115 | 2 785 712 |
| 18. | 30. | 11.7 | 27 857 115 | 2 785 712 |
| 19. | 37. | 9.6 | 22 857 120 | 2 285 712 |
| 20. | 38. | 9.6 | 22 857 120 | 2 285 712 |
| 21. | 39. | 9.6 | 22 857 120 | 2 285 712 |
| 22. | 40. | 9.6 | 22 857 120 | 2 285 712 |
| 23. | 41. | 9.6 | 22 857 120 | 2 285 712 |
| 24. | 42. | 9.6 | 22 857 120 | 2 285 712 |
| 25. | 43. | 9.6 | 22 857 120 | 2 285 712 |
| 26. | 44. | 9.6 | 22 857 120 | 2 285 712 |
| 27. | 45. | 10.6 | 25 238 070 | 2 523 807 |
| 28. | 46. | 10.2 | 24 285 690 | 2 428 569 |

Начальная цена каждого лота указана без учета НДС.

Задаток в размере 10 процентов от начальной цены лота перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «Белпромстройбанк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583. Договор купли-продажи между продавцом и покупателем подписывается в течение 3 дней с даты проведения аукциона. Оплата объекта осуществляется в течение 5 календарных дней с даты подписания договора купли-продажи. Аукцион состоится 26 сентября 2007 года в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 25 сентября 2007 года до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: 227-48-36, 227-40-22 –** УП «Минский городской центр недвижимости».

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЧЭХІЯ ВЫЛУЧЫЛА ЎМОВЫ ЗША ПА РАЗМЯШЧЭННЮ ПРА

**Кіраўніцтва Чэхіі патрабуе ад ЗША ў абмен на размяшчэнне на сваёй тэрыторыі радыялакацыйнай станцыі (РЛС) сістэмы амерыканскай проціракетнай абароны прадаставіць доступ да інфармацыі, атрыманай з гэтай РЛС.** Паводле слоў кіраўніка чэшскага МЗС Карэла Шварцэнберга, «радыялакацыйная станцыя павінна размяшчацца на тых жа ўмовах, што і амерыканская РЛС у Вялікабрытаніі».

### ЦЭНТРАБАНК РФ АБ'ЯВІЎ АБ КРЫЗІСЕ РАСІЙСКАЙ БАНКАЎСКАЙ СІСТЭМЫ



**Намеснік старшыні Цэнтрабанка Расіі Генадзь Мелік'ян заявіў, што расійская банкаўская сістэма перажывае крызіс з-за ўзрушэнняў, якія адбыліся ў ЗША.**

Ён заклікаў расійскія банкі не захапляцца замежнымі пазыкамі, таму што ў выпадку росту курсу долара гэта можа прывесці да вялікай рызыкі.

Паводле словаў Мелік'яна, доля замежных займаў у банках не павінна перавышаць 20 працэнтаў. Як удакладніў банкір, 25 працэнтаў гэта ўжо дрэнна, а 30 — зусім дрэнна. У бяспечныя працэнты сёння ўкладваюцца далёка не ўсе расійскія банкі. У той жа дзень Цэнтрабанк абвясціў аб скарачэнні за тыдзень золатавалютных рэзерваў на 5,5 млрд доляраў. Нягледзячы на гэта, рэзервы па-ранейшаму дастатковыя, перакананы ў Цэнтрабанку.

### МАГЧЫМА, ЗНОЙДЗЕНЫ АСТАНКІ ЧЛЕНАЎ ЦАРСКАЙ СЯМ'І



**Органы пракуратуры аднавілі крымінальную справу, узбуджаную па факту выяўлення так званага «першага пахавання» мяркуемых астанкаў членаў царскай сям'і на Капцякоўскай дарозе пад Екацярынбургам. Знойдзеныя ўчора астанкі — як мяркуецца, дзяцей імператара Мікалая II Аляксея і Марыі — перадалі на экспертызу.**

Месца пошукаў археолагамі было ўстаноўлена на аснове дакумента, які яшчэ нядаўна знаходзіўся пад грыфам «сакрэтна». У ім утрымліваецца падрабязны аповед Якава Юроўскага, які кіраваў расстрэлам царскай сям'і. З дакумента вынікае, што было прадпрынята некалькі няўдалых спробаў схаваць астанкі расстраляных. У рэшце рэшт целы 9 з 11 забітых былі абліты сернай кіслатой і закапаны побач з дарогай у Парасёнкаўскім лозе, а астатніх двух — цэсарэвіча Аляксея і адной з княжон — спалены на пэўнай адлегласці ад асноўнага пахавання, скінуты ў яму і закапаны. Гэта было зроблена для таго, каб колькасць целаў не супадала з колькасцю забітых у доме Іпацьева.

### ТАЛІБЫ АБМЯНЯЮЦЬ ПАЎДНЁВАКАРЭЙСКІХ ЗАЛОЖНІКАЎ НА ВЯЗНЯ ПОЛЬСКАЙ ТУРМЫ

**Афганскі ісламскі рух «Талібан» прапануе абмяняць 19 паўднёвакарэйскіх заложнікаў на аднаго са сваіх лідараў, які зараз знаходзіцца ў польскай турме.**

Пума, як называюць свайго лідара талібы, быў захоплены палякамі з міжнароднага кантынгенту 16 жніўня на поўдні Афганістана. Паводле словаў міністра абароны Польшчы Аляксандра Шчыгала, Пума займаў чацвёртую пазіцыю ў спісе найбольш вышукваемых у Афганістане тэрарыстаў.

ISSN 1990 - 763X

07159>

КУРСЫ ВАЛЮТ

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.08.2007 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 147,00 |
| 1 еўра | 2 914,55 |
| 1 латвійскі лат | 4 176,64 |
| 1 літоўскі літ | 844,10 |
| 1 чэшская крона | 105,31 |
| 1 польскі злоты | 759,02 |
| 1 расійскі рубель | 83,34 |
| 1 украінская грыўня | 428,03 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 25,7609 |
| 10 UAH | 51,2145 |
| 1000 BYR | 11,9790 |
| EUR | 34,9344 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 24.08.2007 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2140 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпісвайцеся на часопіс «Галоўны Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

### НАЛІЧАНАЯ СЯРЭДНЯЯ ЗАРПЛАТА РАБОТНІКАЎ БЕЛАРУСІ Ў ЛІПЕНІ СКЛАЛА BR731 ТЫС. 975

**паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Міністэрстве статыстыкі і аналізу рэспублікі. Гэты паказчык у чэрвені гэтага года быў роўны Br710 тыс. 232.**

Налічаная сярэдняя заработная плата рабочых і служачых у ліпені гэтага года склала Br747 тыс. 355 (у чэрвені яна была Br728 тыс. 15).

Школа падаткаплацельшчыка

# ЯКІ ПАДАТАК І ЯК ПЛАЦІЦЬ, КАЛІ ПРАЦАВАЎ У РАСІІ?

**На пытанні чытачоў «Звязды» адказвае старшы дзяржаўны падатковы інспектар Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЗЯЛЕЎСКІ.**

***— Я беспрацоўны невялікага гарадка. Зараз шукаю працу ў Расіі. Планую адсутнічаць у краіне больш года. Ці павінен я буду плаціць падаходны падатак у Беларусі?***

**Ігар ВЫСОЦКІ,** *г. Ліда*

— Калі вы будзеце адсутнічаць на тэрыторыі Беларусі больш за 183 дні ў календарным годзе, то ўжо не з'яўляецеся падатковым рэзідэнтам РБ, таму плаціць падатак на даходах, атрыманых за мяжой, у сваёй краіне вам не трэба.

***— Пастаянна жыву ў Беларусі, але друкуюся ў выданнях Расіі, за што атрымліваю адтуль аўтарскія ўзнагароджанні. Якім чынам ажыццяўляецца падаходнае абкладанне такіх даходаў, атрыманых з-за мяжы?***

**Вікторыя ПРЫЧОСНАЯ,** *г. Мінск.*

— Вылічэнне і аплата падаходнага падатку з даходу, якія былі атрыманы фізічнымі асобамі (падатковымі рэзідэнтамі РБ) ад крыніц за межамі Беларусі, ажыццяўляецца згодна з артыкулам 22 Закона аб падаткаабкладанні. Так, грамадзяне, якія атрымліваюць даход за мяжой і плацяць падатак з такіх даходаў у адпаведнасці з заканадаўствам замежнай дзяржавы, абавязаны не пазней 1 сакавіка наступнага года прадаставіць у падатковы орган па месцы пастаноўкі на ўлік падатковую дэкларацыю, у якой паказаць сумы фактычна атрыманых даходаў. Пры гэтым сумы падатку, аплачанага за межамі Беларусі ў адпаведнасці з заканадаўствам іншых дзяржаў, падлягаюць заліку пры ўплаце падатку ў нашай краіне, калі такі метад пазбаўлення двайнога падаткаабкладання прадугледжаны адпаведным дагаворам. Паміж нашай краінай і Расіяй такі дагавор заключаны.

Залік падатку, уплачанага за мяжой, ажыццяўляецца на падставе пададзеных у падатковы орган дакументаў, якія выдаюцца плацельшчыку падатковым агентам (у нашым выпадку — друкаваным выданнем Расіі). Такі залік будзе зроблены і ў тым выпадку, калі дадзеныя дакументы не завераны кампетэнтным органам замежнай дзяржавы. Аднак плацельшчыку на працягу года трэба будзе прадаставіць падатковому органу дакументы аб атрыманым даходзе і аб уплаце падатку за мяжой, пацверджаныя падатковым або іншым кампетэнтным органам замежнай дзяржавы. У адваротным выпадку падатак будзе пераразлічаны і выплачана даплата ў бюджэт з налічэннем пені.

***— Падатковыя органы Расіі адмаўляюцца пацвердзіць атрыманыя мною (працаваў на прадпрыемстве ў г. Маскве) даходы і ўплачаныя падаткі без запыту. Як будзе ажыццяўляцца залік уплачанага падаходнага падатку і што трэба рабіць, каб атрымаць пацверджанне з падатковых органаў Расіі?***

**Сяргей КАНАШЫЦ,** *г. Орша.*

— Залік падаходнага падатку, які быў уплачаны грамадзянінам у адпаведнасці з заканадаўствам замежных дзяржаў, у залік уплаты падаходнага падатку ў РБ з адпаведнага віду даходу ажыццяўляецца на падставе дакумента падатковага органа замежнай дзяржавы аб уплаце падатку. Прадстаўляць такое пацверджанне павінна фізічная асоба, якая атрымлівае даход за мяжой. Пры адсутнасці ж такога пацверджання падаходны падатак уплачваецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Беларусі ў поўным аб'ёме.

Для атрымання пацверджання ўплаты падаходнага падатку на тэрыторыі Расіі фізічнай асобе неабходна пісьмова звярнуцца з запытам у падатковы орган РФ па месцы пастаноўкі на падатковы ўлік юрыдычнай асобы, якая выплачвала даход, г.з. ва Упраўленне федэральнай падатковай службы Расіі па г. Маскве па адрасу: 115191, г. Масква, вул. В. Тульская, 15. Да запыту аб выдачы такой даведкі неабходна прыкласці даведку па форме 2-НДФЛ і копію пашпарта (ліст з фотаздымкам, ліст з прапіскай). Па выніках разглядання падатковы орган выдасць на рукі (ці па пошце) завераную і падпісаную кіраўніком падатковага органа даведку аб сумах атрыманага даходу і ўтрыманага падатку.

У выпадку адмовы ў выдачы такой даведкі фізічная асоба можа звярнуцца ў Міністэрства па падатках і зборах РБ з аналагічнай заявай, а таксама копіяй ліста падатковага органа Расіі аб адмове прадаставіць пацверджанне.

**Падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.**

# ГАЛУБІНАЕ ШЧАСЦЕ УЛАДЗІМІРА ЗАЛЕСКАГА

**...Калі ён прыгадвае сваё дзяцінства, перад вачыма паўстаюць каляровыя малюнкі. Раскідзісты клён, што рос ля брамы... Шчаня, якое ціснулася да хлапечых ног... І над усім гэтым — шматгалосае буркаванне галубоў. Іх шмат тады трымалі ў Чэрвені. І калі чародкі птушак узнімаліся ў паветра, не было відовішча больш прыгожага! Не дзіўна, што сваю першую галубятню Валодзя пабудаваў яшчэ ў школьныя гады. Але наўрад ці думаў тады, што галубагадоўля стане самай вялікай яго любоўю і самым вялікім шчасцем. А ўжо чвэрць стагоддзя — яшчэ і самым галоўным заняткам.**



Шчыра прызнаюся: такіх прыгожых галубінага роду бачыла ўпершыню. Хвасты некаторых — бы выразаныя ўручную. Адразу прыцягвалі папяровыя выцінанкі. А якія прыгожыя лапкі, што па пышнасці пер'я (касмы) не саступаюць хвастам! Сапраўды, надзвычай мілыя, пяшчотныя і крыштальныя істоты (нягледзячы на шматлікія прадукты жыццядзейнасці. Жарт!). І ні ў якое параўнанне не ідуць са звычайнымі надзьмутымі шызымі сурадзічамі — аматарамі збірацца ў людных месцах з надзеяй перахапіць што-небудзь смачнае. Я нават не ведала, што такія прыгажуны і прыгажуні існуюць.

Зрэшты, галубоў Уладзіміра Залескага проста на вуліцы ці ў паветры не ўбачыш. Бо ў небе за імі палююць каршуны, якіх апошнім часам шмат развялося, а на зямлі — «звер страшны кот»... А вось на міжнародных выставах — калі ласка! Там Уладзімір Уладзіміравіч з задавальненнем дэманструе свае дасягненні ў справе селекцыі, паляпшэнні вядомых усім парод. І аматары, і прафесіяналы гэтай справы сыходзяцца ў адным: пара ўжо называць яго пароды не Арлоўскімі, не Луганскімі, а ... Залескімі. Заслужыў.

— Нягледзячы на сусветную папулярнасць, пра галубоў у нас ведаюць мала, — разважае Уладзімір Уладзіміравіч. — Большасць адрознівае іх толькі па афарбоўцы пер'я: шызы, белы, чырвоны... А вось галубаводы (не галубятнікі — розніца прынцыповая!) могуць вызначыць пароды і чыстакроўнасць птушак па стандартах. Існуючыя стандарты — гэта асноўнае, што бярэцца пад увагу падчас ацэнкі голуба на конкурсах і выставах. Напрыклад, галава ў гэтага вось белага павінна быць дугою, пачынаючы з дзюбы. Сама дзюба — сярэдняй велічыні, патоўшчаная. Вока і павекі — добра выражаныя. Нізкая пасадка, касма...

Развядзенне галубоў, паляпшэнне пароды — гэта занятак для душы. Сістэматычны догляд за птушкамі выпрацоўвае ў чалавека пунктуальнасць і працалюбства. Ва ўсім свеце гэтай справай займаюцца сотні тысяч людзей розных узростаў. Прыгажосць гэтых птушак і нервы лечыць, і сіл дадае. Кожная з іх — як экзатычная кветка, якую патрэбна вырасціць. Як толькі я заходжу ў галубятню, адразу бачу, які з маіх гадаванцаў захварэў, якому патрэбны асаблівы догляд...

Па прызнанню Уладзіміра Залескага, самы элементарны клопат пра галубоў, якіх у яго шэсцьсот (па некалькі соцень разнавіднасцяў дзвюх парод), займае ў дзень прыкладна пяць гадзін. Гэта не лічачы чысткі, акальцоўвання маладняку, селекцыйнай працы, назірання, запісаў ды іншага... Для прагулак у цёплую пару года ён зрабіў для птушак вялікія вальеры з сеткі, якія абараняюць іх ад небяспекі як з паветра, так і з зямлі. Галубы Уладзіміра Залескага — чыстыя, дагледжаныя, здаровыя. Гонар гаспадара і ўсёй Беларусі, бо на выставах займаюць толькі прызавыя месцы.

У 2003 годзе ў Мінску на міжнароднай выставе «Птушка, якая нас аб'ядноўвае» галубавод-селекцыянер з Чэрвеня за сваіх Растоўскіх і Луганскіх атрымаў залатыя і сярэбраныя медалі. Летась клубу галубаводаў і аматараў птушак споўнілася 45 гадоў. Да гэтай даты пад эгідай Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя ладзілі другую міжнародную выставу-кірмаш. Паводле слоў Уладзіміра Залескага, атрымалася сапраўднае свята, удзел у якім узялі аматары птушак з Беларусі і краін блізкага замежжа. І зноў высока ацэнена праца нашага земляка. У Чэрвень ён прывёз чатыры залатыя і адзін сярэбраны медаль.

Але зусім не дзеля славы і ўзнагарод з самага маленства займаецца Уладзімір Залескі развядзеннем галубоў. Яны — яго самае вялікае захапленне, любоў і шчасце. А падтрымліваюць Уладзіміра ва ўсіх пачынаннях жонка Алена, дачка Наталля і сын Аляксандр.

Дарэчы, ёсць на падворку Залескіх і іншая любімая «жыўнасць». Гэта надзвычай пацешныя мопсікі Бэла і Лола, якім заўсёды ёсць справа да ўсяго і ўсіх. А яшчэ — два прадстаўнікі кашачай пароды, якія дужа здзівілі тым, што ні разу не кінулі позірку ў бок галубінага выгулу. Вось гэта дрэсура! Ці... хітрая кашачая гульня?

І яшчэ хочацца колькі слоў сказаць пра гаспадыню — Алену Залескую. Сёлета яна разам з аднадумцамі ўпрыгожыла месца сваёй працы — тэрыторыю ачышчальных збудаванняў. Апрача традыцыйных кветнікаў і альпійскіх горак, яны стварылі каменнага драконніка, выкапалі міні-сажалку... А на адным са схілаў развярнуў пышны хвост... паўлін! Шыкоўная кветкавая разнастайнасць цешыць і на ўласным падворку. Кветкі і ў вазонах, і на клумбах, і ў вадаёме, які ахоўвае забаўны гномік з ліхтаром... Словам, уладанні Уладзіміра і Алены Залескіх не зблытаеш з іншым. Бо тут пануе любоў да ўсяго жывога.

**Святлана АДАМОВІЧ,**
*Чэрвеньскі раён.*

**Фота аўтара.**

Крымінал, здарэнні

## ДТЗ З КРЫМІНАЛЬНЫМ ПРАЦЯГАМ

**Вадзіцель, які збіў веласіпедыста, спрабаваў заблытаць сляды ўчыненага злачынства.**

Паводле інфармацыі ўпраўлення Дзяржаўтаінспекцыі, здарэнне адбылося на дарозе паблізу вёскі Двор-Пліна Ушацкага раёна. А палове шостай раніцы 38-гадовы жыхар Лепеля, які кіраваў аўтамабілем «Фольксваген», збіў 75-гадовага пенсіянера, мясцовага жыхара, які рухаўся на веласіпедзе. Цела загінулага вадзіцель загрузіў у багажнік аўто, пасля чаго адвёз у неўстаноўленае месца і скінуў у кювет. Затрымалі вадзіцеля супрацоўнікі аддзела ДАІ Лепельскага РАУС у ходзе плана «Перахват».

**Ігар ГРЫШЫН, Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ЧЭКІСТЫ ВЫЙШЛІ НА ПАЛЯНУ...

**Не дзеля адпачынку ці нейкіх там забаў. А з канкрэтным інтарэсам, які ўяўляў сабой небяспеку ў тым плане, што паляна гэта была не простая, а... канапляная, і таму служыла наркаманам для ачмурэння.**

Самае дзіўнае ў тым, што гэты зялёны астравок дурману знаходзіўся ў нейкім паўкіламетры ад вёскі Новая Антонаўка Калінкавіцкага раёна, і нікога гэта не трывожыла. Пакуль аб тых каноплях не даведаліся работнікі Мазырскага аддзела УКДБ па Гомельскай вобласці. Па іх даручэнню каноплі былі скошаны і спалены супрацоўнікамі мясцовага лясгаса. А было там гэтага дурману больш чым 7 пудоў.

## ЁН ПРАСІЎ РАССТРАЛЯЦЬ ЯГО

Гэтага ж патрабаваў і дзяржаўны абвінаваўца. За што? За тое, што 50-гадовы жыхар Хойніцкага раёна, раней судзімы, у лютым гэтага года ў вёсцы Ізбынь (наша газета давала такую інфармацыю) забіў трох жанчын.

Гэтымі днямі адбыўся суд, які ўлічыў усе абставіны справы, і нягоднік усё астатняе жыццё правядзе за кратамі.

## САМА САДЗІК Я САДЗІЛА...

**На заяву загадчыцы аднаго з магазінаў Брагіна аб тым, што ноччу нехта яго абрабаваў, работнікі мясцовай міліцыі адрэагавалі аператыўна.**

Было ўстаноўлена, што розных тавараў знікла больш як на 13 млн рублёў, што зладзеі дзейнічалі акуратна і г.д. Самае ж цікавае было наперадзе. Выявілася, што крадзеж учыніла сама загадчыца лаўкі, каб замесці сляды: у магазіне была недастача. Вось і атрымалася, як у той песні «Сама садзік я садзіла...».

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

## ЗНОЙДЗЕНЫ АСТАНКІ МІРНЫХ ЖЫХАРОЎ

**Нядаўна ваеннаслужачыя сумесна з прадстаўнікамі ваенкамата і работнікамі РАУС падчас правядзення раскопак ля вёскі Варонка Шаркаўшчынскага раёна Віцебскай вобласці знайшлі астанкі людзей часоў Вялікай Айчыннай вайны: каля 70 чалавек.**

Мясцовыя жыхары старэйшага ўзросту расказалі, што ў вайну тут былі расстраляны грамадзяне Беларусі яўрэйскай нацыянальнасці. Зараз вырашаецца пытанне аб перапахаванні загінулых. Аб гэтым расказалі «Звяздзе» ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Віцебскага аблвыканкама.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## АД ІНСПЕКЦЫІ НЕ СХАВАЕШСЯ

**Яўна не пашанцавала сям'і індывідуальных прадпрымальнікаў з Калінкавіцкага раёна.**

Галава сям'і, яго жонка і сын не змаглі пацвердзіць падатковай інспекцыі легальныя крыніцы даходаў на набыццё кватэры, чатырох грузавікоў і іншыя рэчы, таму вымушаны будуць уплаціць 32 млн рублёў падаходнага і адзінага падатку.

А ўсяго за першае паўгоддзе 124 фізічныя асобы, жыхары Гомельшчыны, таксама не змаглі пацвердзіць у поўным аб'ёме законныя крыніцы даходаў. Таму ў бюджэт ад іх паступіць 119 млн рублёў. Вывад такі: ад інспектараў па падатках і зборах нікуды не схаваешся. Гэта трэба добра памятаць.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

## ГАРЫМ, БРАТКІ. ПА СВАЁЙ ВІНЕ

**Толькі з пачатку жніўня выратавальнікам-пажарным Мінскай вобласці паступіла 29 паведамленняў аб узгараннях на тарфяніках і 23 — аб пажарах у лясах.**

Сярод сумных лідараў — Мінскі, Пухавіцкі, Смалявіцкі і Лагойскі раёны. Усё проста — адбіваецца блізкасць мегаполіса. Асабліва сітуацыя ўскладняецца ў выхадныя. Напрыклад, толькі за мінулыя на Міншчыне адбылося 28 пажараў — пераважна з-за так званага чалавечага фактару. Самы буйны пажар адбыўся ў Мінскім раёне паблізу вёскі Дварэц — на плошчы каля гектара. На яго ліквідацыі на працягу некалькіх гадзін працавала 20 чалавек і 6 адзінак тэхнікі. А ўсяго з пачатку жніўня для тушэння пажараў у лясах і на тарфяніках было задзейнічана 59 адзінак тэхнікі і 168 чалавек асабовага складу. З пачатку ж года ў Мінскай вобласці адбылося 139 лясных і больш за 260 тарфяных пажараў.

Напярэдадні чарговых выхадных варта яшчэ раз нагадаць: парушальнікаў патрабаванняў пажарнай бяспекі можа чакаць штраф да 25 базавых велічынь, а калі лесу будзе нанесены ўрон — да 50 базавых велічынь. За раскладзенае ў неналежным месцы вогнішча можна заплаціць штраф да 12 базавых велічынь.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Спорт-тайм

## У «СТАЛІЦЫ» ВЫЗНАЧАЦЬ МАЦНЕЙШЫХ КІБЕРСПАРТСМЕНАЎ

Мацнейшыя кіберспартсмены Беларусі выйдуць на арэну віртуальных баталій, каб трапіць у нацыянальную зборную, якая адправіцца на Сусветныя камп'ютарныя гульні. Нацыянальны адборачны турнір пройдзе 26 жніўня ў нядзелю ў гандлёвым цэнтры «Сталіца», што на плошчы Незалежнасці (адкрыццё фінала адбудзецца а 10 гадзіне). Акрамя спаборніцтваў у дысцыплінах Counter Strike 1.6, Fifa 2007, Starcraft и Warcraft III TFT, запланавана і забаўляльная праграма з гульнямі і конкурсамі для балельшчыкаў, напрыклад, выберуць самую прыгожую дзяўчыну кіберспорту «Miss WCG-Belarus-2007». Уваход бясплатны. Сталіцай камп'ютарнай Алімпіяды гэтага года стаў амерыканскі Сіэтл, які збярэ кіберспартсменаў з 70 дзяржаў.

## «БРОНЗАВЫ» МЯЧ

На 14-м міжнародны турніры «Кубак Літоўскай федэрацыі футболу» сярод юнакоў 1991 года нараджэння (U-17) у Паланзе беларусы занялі трэцяе месца. У матчы за «бронзу» падначаленыя Пятра Міхеева сустрэліся з камандай Азербайджана і выйгралі — 2:1.

## «МЕТАЛУРГ» ПРЫМЕ МЕЗІНА

Пасля таго, як хакеісту Андрэю Мезіну не ўдалося пазбавіцца ад статусу легіянера ў суперлізе, кіраўніцтва магнітагорскага «Металурга» паведаміла, што гатова заключыць з экс-галкіперам нацыянальнай зборнай Беларусі двухгадовае пагадненне. Расійскаму клубу давядзецца плаціць за Мезіна легіянерскія падаткі — звыш $320 тыс., таму ўмовы першапачатковага кантракту будуць перагледжаны. Заробак варатара зменшыцца. Аднак юрысты хакеіста працягваюць змагацца: яны гатовы дайсці да Канстытуцыйнага суда Расіі, звярнуцца ў Грамадскую палату Расіі. У абарону Мезіна таксама выступіў Папячыцельскі савет Федэрацыі хакея Расіі.

## НІЧЫІХ НЕ БУДЗЕ?

У чэмпіянаце краіны па хакею з шайбай не выключана магчымасць адмены... нічыйных зыходаў матчаў рэгулярнага першынства, а таксама паядынкаў плей-оф, — паведамляе сайт старонкі хакея ў Беларусі. Гэта змяненне дапаможа павысіць відовішчнасць гульняў. За перамогу каманды ў асноўны час плануецца налічваць 3 ачкі, у авертайме (5 хвілін) і серыі булітаў — 2. За паражэнне ў авертайме і серыі булітаў ігракі атрымаюць 1 ачко. Даная схема будзе разглядацца на пасяджэнні выканкама ФХРБ.

36,6°

# КАТАРАКТА — НЕ ПРЫСУД

МЕДЫКІ ЛІЧАЦЬ КАТАРАКТУ ЗАХВОРВАННЕМ, ГЕРАНТОЛАГІ — ПРАЯВАЙ СТАРАСЦІ...

**Навукова даказана, што да 90 працэнтаў інфармацыі мы атрымліваем праз зрок. Ён дазваляе чалавеку арыентавацца ў навакольным свеце. Аднак па розных прычынах у той ці іншай ступені можа зніжацца. Адной з асноўных прычын слепаты і дрэннага зроку з'яўляецца катаракта. Такую назву хваробе далі старажытныя грэкі («катаракта» ў перакладзе з грэчаскай «вадаспад»), бо пры ёй погляд нібы затуманьваецца, чалавек глядзіць як быццам праз вадзяную заслонку або праз запацеўшае шкло, якія перашкаджаюць святлу пранікнуць унутр вока.**

Катаракта — гэта поўнае або частковае памутненне хрусталіка, рэакцыя яго празрыстага рэчыва ў адказ на ўздзеянне неспрыяльных фактараў.

Хрусталік, так званая біялагічная дваякавыпуклая лінза, складаецца з вады, бялкоў, мінеральных рэчываў. У норме ён празрысты, не мае сасудаў, нервовых валокнаў. Сілкуецца за кошт унутрывочнай вадкасці, якая пастаянна выпрацоўваецца ў воку і абмывае яго. Гэта вадкасць прыносіць усе неабходныя рэчывы і забірае адпрацаваныя прадукты. З узростам і пры шэрагу захворванняў у ёй назапашваюцца прадукты абмену, якія могуць аказваць таксічнае ўздзеянне, у тым ліку і на хрусталік, што прыводзіць да парушэння яго сілкавання і, як вынік, да страты празрыстасці, гэта значыць да катаракты.

Звычайна захворванне пашкоджвае абодва вокі, але на адным можа праявіцца на некалькі месяцаў (або нават гадоў!) раней, чым на другім. Часцей за ўсё хвароба сустракаецца ў пажылых людзей. Гэта «старэчая», або ўзроставая катаракта. Але ў дзяцей катаракта таксама можа быць. Звычайна яна мае спадчынную прыроду і называецца прыроджанай (1 на 10000 нованароджаных). Яе развіццё звязваюць з унутрывантробным інфіцыраваннем плода; злоўжываннем цяжарнай жанчынай алкаголем, курэннем, наркотыкамі; спадчыннымі захворваннямі. Акрамя таго, катаракта ў любым узросце можа быць вынікам траўмы вока — моцнага ўдару, парэзу, праколу, тэрмічнага або хімічнага апёку. У такім выпадку гаворка ідзе аб катаракце. Вылучаюць яшчэ дыябетычную катаракту, якая развіваецца ў хворых на цукровы дыябет. Пры ўздзеянні на чалавека радыяцыі, у прыватнасці рэнтгенаўскага выпраменьвання, можа ўзнікнуць прамянёвая (радыяцыйная) катаракта.

Сімптомы катаракты разнастайныя, але асноўны з іх — расстройства зроку. Спачатку ён зніжаецца нязначна. Хворыя скардзяцца на з'яўленне «мушак», «дыму», плямаў перад вачамі, калі ўзнікае жаданне іх працерці. Часам чалавек бачыць хворым вокам некалькі прадметаў замест аднаго, асабліва калі яны свецяцца (напрыклад лямпачкі). Пачатковая стадыя захворвання можа доўжыцца ад 1—2 да 10 гадоў. Паступова катаракта ўзмацняецца, і вастрыня зроку зніжаецца яшчэ больш. Хрусталік можа набухаць, павялічваючыся ў аб'ёме, што, як правіла, суправаджаецца павышэннем унутрывочнага ціску. У запушчаных выпадках вока можа адрозніваць толькі святло ад цемры.

**Як засцерагчы сябе і блізкіх ад катаракты?**

Прафілактыка катаракты — гэта, у асноўным, выкананне агульных нормаў і правілаў здаровага ладу жыцця: не курыць, не злоўжываць спіртным, пазбаўляцца ад лішняй вагі, пазбягаць эмацыянальных стрэсаў, ужываць вітаміны С, Е, бета-карацін, мікраэлементы (селен і цынк), не захапляцца газіраванымі напоямі і кавай. Аднак ёсць і спецыяльныя рэкамендацыі: засцерагаць вочы ад ультрафіялетавага і мікрахвалевага выпраменьвання; быць асцярожнымі пры прыёме лекаў, якія павышаюць святлоадчувальнасць тканак (антыгістамінныя прэпараты, транквілізатары, антыдэпрэсанты, некаторыя процізачаткавыя сродкі, стэроіды); кантраляваць узровень цукру ў крыві і з дапамогай урача выбраць найбольш аптымальны метад лячэння нават самых пачатковых праяў дыябету, які з'яўляецца адным з галоўных ворагаў зрокавага апарату чалавека.

> ***Западозрыць у сябе катаракту можна па наступных прыкметах:***
>
> **пагаршэнне зроку не звязана з павышанай нагрузкай на вочы;**
> **стала цяжка чытаць кніжкі нават з буйным шрыфтам, і акуляры не дапамагаюць;**
> **аддаленыя прадметы таксама цяжка адрозніць;**
> **рэчы страцілі выразнасць і ў вачах дваіцца;**
> **вочы сталі вельмі адчувальнымі да святла;**
> **зрэнка, якая ў норме выглядае чорнай, можа набыць жаўтаватае адценне або пабялець.**

**Што рабіць пры пагаршэнні зроку?** Парада адна — ва ўсіх выпадках трэба як мага раней звярнуцца да ўрача-афтальмолага.

**Як лечаць катаракту?** На жаль, ніякімі медыкаментознымі сродкамі — ні каплямі, ні мазямі, ні таблеткамі, а таксама ніякімі практыкаваннямі нельга зняць памутненне хрусталіка. Пры іх дапамозе можна толькі запаволіць развіццё хваробы.

Адзіны спосаб лячэння катаракты — хірургічнае ўмяшанне. Першыя ўпамінанні аб гэтым сустракаюцца ў індыйскім манускрыпце, які датаваны пятым стагоддзем да Нараджэння Хрыстова. Апісаны ў ім — рэклінацыя — заключаецца ў простым перамяшчэнні памутнелага хрусталіка ў шклопадобнае цела (дарэчы, ён выкарыстоўваецца і цяпер). Чалавек пасля такой аперацыі сапраўды пачынае бачыць. Для больш-менш нармальнага зроку патрэбна дадатковая карэкцыя з дапамогай моцных — звыш +10D — акуляраў або кантактных лінзаў.

Сучасныя метады заснаваны на выдаленні памутнелага хрусталіка і замене яго штучнай лінзай. Найбольш распаўсюджаным у свеце, бяспечным і найменш траўматычным з'яўляецца метад факаэмульсіфікацыі, які заключаецца ў выдаленні катаракты з дапамогай ультрагуку праз мікрапракол. Падчас аперацыі ядро хрусталіка выдаляецца так, каб захаваць яго капсулу. Затым праз той жа мікрапракол у капсулу хрусталіка ўводзіцца ў згорнутым выглядзе гібкі штучны хрусталік з памяццю формы, потым ён расправаўляецца і займае патрэбнае становішча ўжо ўнутры вока. Пры гэтым прымяняецца анестэзія толькі ў выглядзе капель. Мікрапракол настолькі малы, што герметызуецца самастойна, адразу пасля заканчэння аперацыі. Нягледзячы на такія складаныя маніпуляцыі, аперацыя доўжыцца каля 10—20 хвілін. І ўжо праз 1—2 дні можна аднавіць зрокавыя нагрузкі. Больш як у 90 працэнтаў хворых пасля такога лячэння аднаўляецца нармальны зрок. Зразумела, што праводзяцца такія аперацыі толькі ў спецыялізаваных клініках.

Выбар метаду лячэння катаракты робіць акуліст на падставе даных абследаванняў. Таму чым раней вы асмеліцеся на правядзенне аперацыі, тым хутчэй зможаце вярнуцца да паўнацэннага актыўнага жыцця.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

Простая мова

# ГАСТРАНОМ АДЧЫНЯЕЦЦА Ў ВОСЕМ...

**Адкрыццё (здаецца, уласнае?): чым даўжэй жывеш, тым цяжэй расставацца з рэчамі.**

**...Прыяцелька новы халадзільнік купіла. Старэнькі — побач паставіла, думала ён яшчэ шафкай паслужыць. А не выйшла — замінаць стаў. Пазваніла знаёмым камунальнікам, сказала:**

**— Хлопцы, я вам на бутэльку дам. Толькі выкіньце.**

**Згадзіліся тыя, прыйшлі, паглядзелі, спыталі:**

**— А ён што — не працуе?**

**— Працуе.**

**— О! Дык гэта ж рэч! Мы яе ў капцёрку паставім! Будзем «тармазкі» трымаць...**

**— Ды што хочаце... Толькі забярыце.**

**Забралі.**

**...Што цікава — і халадзільнік, і... грошы на бутэльку.**

## ДОБРА ДЫ НЕ ЎСЁ

Багатаму і чорт дзіця калыша. У Славіка (па словах цешчы. — **Аўт.**) усё і так было — пасада, машына, дача, кватэра, а ён яшчэ адну збудаваў — у цагляным доме, з двума туалетамі, з прасторнай кухняй...

Цешча паглядзець паехала. Не з пустымі рукамі: у яе агуркі ўрадзілі, тры кашы неяк выбрала. Потым — лепшыя, невялічкія, адзін у адзін — у рукзак і за плечы.

Везла ў электрычцы і бачыла, як зараз, у зяця, у ванну іх высыпле, як халоднай вадзічкай залье, потым вымые, у слоічкі зложыць... З прыпраўкамі...

А зайшла туды і ахнула: пасудзіна сама бялюткая, бліскучая, затычкі люстраныя, ручачкі, каб зручней садзіцца было, донца ў клетачку, каб не слізка стаяць...

Ну як туды з агуркамі, — грэх жа! У кухні мыла. А зяцю потым выдала, што французы (яны тую ванну зрабілі), канешне, малайцы. Усё прадумалі... Апроч агуркоў.

## ВАЎКОЎ БАЯЦЦА...

«Хлопец здуру ажаніўся...», — гэта пра яго, пра Валіка. З войска ён праз Мінск вяртаўся, — заехаў да лепшага сябра. Выпілі з ім, пайшлі на танцы ў суседні інтэрнат, падчапілі дзяўчат...

Валік сваю дадому праводзіў. Па вясковай звычцы прыціснуў ля дзвярэй. Думаў, аплявушыць, а яна — наадварот: у кватэру вядзе...

Пасля ўсяго, што там адбылося, думаў, іншага выйсця няма — жаніцца трэба.

А потым і жыць... Раз жаніўся.

Ён — жыў. І нават не скардзіўся, пакуль не сустрэў Яе, пакуль не адчуў, якое гэта шчасце любіць і быць любімым.

Адно палохала: жанчына гэта (неяк вельмі смела) «прыбірала да рук», прагла не проста мець яго побач, не проста карыстацца, але і распараджацца...

Вось гэтага ён чамусьці збаяўся: адступіў, вярнуўся ў сям'ю.

Зараз — вельмі шкадуе... Пытае сам сябе: «Чаго спалохаўся? Ну насамрэч?.. Хай бы распараджалася».

## ЛЮДЗІ І ЗОРКІ

Часопісаў некалі — раз два і аблічыўся. Затое якіх — «Новый мир», «Наука и жизнь», «Полымя»... Што ні назва — эпоха.

Зараз — хіба што назва. І вокладка. На адной (гэта я на прыпынку, ля шапіка стаю. — **Аўт.**) — па́ра. Досыць прыгожая... Відаць, дома здымаліся, на прасторнай кухні. Па верхніх шафках яе — надпіс (кідка так): «У гасцях у зоркі». Прыглядзелася, хто ж з іх зорка? Ён? Першы раз бачу. Яна? Таксама не ведаю. І прозвішча «маўчыць» — ні аб чым не гаворыць.

...Гэта — ці не прыкмета часу: зорак на зямлі, як на небе (адно — вялікіх няшмат, драбязы — незлічона). І новыя запальваюць.

Значыць, гэта некаму трэба?

Мо, самім жа «зоркам»?

## ПАШЛІ ДУРНОГА...

Лета, гарачыня, смага... Сям'я даручыла піва купіць — «добрага».

Лёгка сказаць, а вось выбраць... «Нешта з тутэйшых, з правераных? — ламлю галаву ў гастраноме, — ці лепш з завезеных? Светлае? Альбо цёмнае? Назваў процьма і адна — цікавей другой.

Начыталася, прыцанілася, нешта ўзяла.

— Што? — па мабільніку спыталі сямейнікі. «Успомніла»:

— «Тры...». Здаецца мядзведзі? А мо, халасцякі, ці таўсцякі...

Высветлілася (калі пад вечар даставала з халадзільніка), што крыху памылілася. Не тры іх было, а адзін. Але мядзведзь... Белы.

(Па аналогіі: скажы мне свой нумар тэлефона. Ну, хоць прыблізна).

## СМАК ПЕРАМОГІ

...Вечна п'яны айчым, голад, вайна, смерць мужа. Тут, відаць, і стальное сэрца забарахліла б, а ўжо звычайнае...

Дзесяцігоддзі «прасядзеўшы» на леках, Маркаўна стамілася: паддалася на ўгаворы ўрачоў, «пад нож» пайшла, «спідометр» сабе паставіла (чытай — кардыястымулятар). Думала, аджыве. Дарэмна — без лекаў усёроўна ніяк.

Каб танней іх купляць, інваліднасці рашыла дабіцца, з месяц штодня ў паліклініку хадзіла, як калісь на працу... Хоць і чула ад людзей, што безнадзейна гэта — групу, маўляў, толькі смяротнікам зараз даюць.

Але яна не адступіла, дайшла да канца. Дайшоўшы, вушам не паверыла — далі групу. Ад слова, як кажуць... Другую. З правам на льготы.

Дамоў, бы на крылах ляцела — шчаслівая была, пакуль не падумала, ад чаго? Асабліва — калі праўду казалі пра смяротнікаў.

## З АБНОВАЙ!

Зноў жа прыкмета часу — гандаль да людзей прыблізіўся. Прычым настолькі, што паўнюткая мэблевая крама пад бокам, лічы.

Сусед там канапу нагледзеў, купіў.

— Калі вам лепей даставіць? — спытала прадавачка.

— Сёння... Мы самі. Хлопцы, бяры.

Учатырох яны вынеслі абнову з крамы, перанеслі праз вуліцу. Там, пад таполямі, расселіся на ёй, адпачылі, пасмалілі...

Фотаапарата шкада не было.

## ...ГЭТА ГУЧЫЦЬ!

На чарговым прыпынку аўтобус бабуль падабраў — аднолькава старэнькіх, худзенькіх, у хустачках.

— Адкуль гэта вы? — спытала ў крайняй адна з пасажырак.

— Ды вось жа, у цэркаўцы былі, у святыньцы нашай.

...Трэцяга дня ў той раён мяне зноў занесла. «Прыпынак «Вуліца Гараўца», — гучна аб'явіў вадзіцель.

А «пачулася» (мне, прынамсі) іншае зусім, тое, бабчына: «Святынька наша».

## ЕСЛИ БЫ МОЛОДОСТЬ ЗНАЛА

...Годы-га́ды.

Яна калісьці прыгожай была. Прыгожай настолькі, што сустрэчныя запавольвалі крок, а спадарожныя забягалі наперад, каб крадком азірнуцца. А яшчэ (часцяком здаралася) з яе не бралі грошай на рынках, прапускалі без чаргі і, зразумела ж, абрывалі тэлефон — ад паклоннікаў адбою не было.

Муж бачыў гэта, кахаў і страціць яе баяўся. А таму — дагаджаў, як мог: жонка ў яго нічога не рабіла, за ляльку ў хаце была. Гаспадарку свякруха пыніла... Яна ж згаджалася і ўнукаў глядзець. Але «лялька» дзяцей не хацела, казала: «Амаль год з жыватом хадзіць могуць толькі крэцінкі. А яна не дурніца — фігуру псаваць».

Горш за тое, незнарок «сапсаваўшы», зацяжарыўшы, на аборт пайшла. А тэрмін вялікі быў... Саграшыла. Ледзь выжыла потым...

Але гэта так, да слова. Прыгажуні той дзевяты дзесятак цяпер. Адна... Нездаровая. Надоечы, ноччу, піць захацела. Устала, колькі крокаў зрабіла, а там палавік падкруціўся. Павалілася (у калідоры) і ўстаць не змагла. Да ранку (пакуль суседка не прыйшла) на падлозе праляжала... Плакала... Думала, як добра было б, каб тады нарадзіла (дачку!), каб яна цяпер побач, каб унукі, унучкі...

А так... Прахам усё — яе прыгажосць, багацце. Аддаць няма каму.... Нават «сталінку» ў цэнтры.

...Маладосць і насамрэч нічога не ведае.

А старасць, па вялікім рахунку, нічога не можа змяніць.

## ГАСТРАНОМ АДЧЫНЯЕЦЦА Ў ВОСЕМ

Пачула б гэта і праз хвілінку, відаць, забылася, а ўбачыла...

Восем... Без лічаных мінут. Гастраном. Хмара чорная ля дзвярэй. У асноўным — з мужчын. У цёмных пакамечаных апратках, з гэткімі ж уцямнелымі тварамі і рублямі ў дрыжачых руках, з адным, але відавочным жаданнем — выпіць.

Што яны і робяць. Праз некалькі хвілін. І не адыходзячы далёка ад касы, ад гастранома.

...У той дзень спіртное ў ім прадавала досыць вабная маладая жанчына. Якая (мне чамусьці здалося. — **Аўт.**) ніколі не выйдзе замуж, бо ніколі не паверыць, што мужчыны бываюць іншымі.

## НАШЫ...

Анекдот (часоў ачакаўскіх...). Трое салдат у рашаючым баі па подзвігу здзейснілі. І начальства іх адзначыць рашыла. Сказала, прасіце, што хочаце, усё вам дамо. Адзін захацеў вялізазны дом для сваёй вялікай сям'і, другі — высокую вежу, каб бачыць, дзе каму дрэнна жывецца і своечасова дапамагчы, трэці (беларус па пашпарту) сказаў:

— Зрабіце так, каб у майго суседа, як і ў мяне, здохла карова.

— А навошта? Мо, лепш табе даць?.. Дзве. Ці нават тры...

— Не, не трэба. Я ўжо купіў... Адмучыўся. А цяпер — няхай ён...

Байку гэту ўспамінаю кожны раз, калі трэба дзесь прыткнуць машыну. І няма ёй месца ні днём у бойкіх месцах, ні вечарам у сваім двары: не разлічаны Мінск на такую колькасць...

Але відавочна і другое: пры паркоўцы многія (ці не нашчадкі таго «героя») метра паўтара пакідаюць з аднаго боку машыны, столькі ж з другога.

Што азначае, відаць: я памучыўся, пакуль стаў, а зараз вы паспрабуйце...

Нашы людзі.

## НА АДНОЙ ЛАЎЦЫ

Перад вераснем школкі прыбраліся. Так і ззяюць новымі фарбамі, новымі пліткамі, новымі ганкамі...

Ля адной — стадыён абнавілі, для балельшчыкаў новыя лаўкі паставілі. Але гэта, як гаворыцца, будзе заўтра. Сёння на крайняй моладзь «тусуецца»: двое (хлопец з дзяўчынай) цалуюцца, двое побач (!?) сядзяць, гамоняць.

І ніякай няёмкасці... Ні ў тых, ні ў другіх.

## АДНА БЯДА НЕ ХОДЗІЦЬ

Жнівень. Спёка. А калі ў аўтобусе яшчэ і людзей, як селядцоў...

— Хутчэй бы дамоў даехаць, — абмахваючыся нейкай паперкай, выдыхае пажылая кабета. — Я там распранаюся і далібог — галяком па хаце хаджу.

— І я б хадзіла, — уздыхае яе знаёмая (і нашмат маладзейшая), — каб люстэркаў не было. А так...

Дрэнна, калі даймае спёка. Яшчэ горш, калі не толькі яна.

**Валянціна ДОЎНАР.**




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Радзіннае

# «Блаславіце, добрыя людзі, нявесту ў дарогу збіраць»

Беларускае традыцыйнае вяселле

**Пасля таго, як родны брат прывядзе нявесту ў хату бацькоў, распачыналася выкананне надзвычай эмацыянальнага і бязмежна багатага сваім сімвалізмам абраду, які атрымаў назву «пасад». Брат або іншы блізкі сваяк браў нявесту за руку і тройчы падводзіў да «пасада» — дзяжы, якая стаяла ў самым пачэсным месцы хаты — у чырвоным куце, пад абразамі.**

**«САДЗЯЦЬ МАЛАДУЮ НА ПАСАД»**

Пасаду вясковай прыгажуні надаваўся статус абрання на трон самога цара. Такое высокае ганараванне нявесты ў кантэксце абрадавых падзей было цалкам заканамерным і апраўданым: усе старэйшыны роду, перш за ўсё тыя, хто валодаў тайнамі захавання традыцыі, публічна надзялялі прадстаўніка маладога пакалення — дзяўчыну-нявесту — правам працягваць род на наступным вітку яго адвечнага жыцця. У самым свяшчэнным месцы хаты — непасрэдна пад сямейнымі абразамі нявесту садзілі на незвычайны трон — сямейную дзяжу, якую паперад накрывалі вывернутым на левы бок (поўсцю наверх) кажухом. Яна, ідучы міма гасцей, павінна была пакланіцца кожнаму — і старому, і малому.

Гэта абрадавае дзеянне несла ў сабе надзвычай вялікую сімвалічную нагрузку. Яно было шматпланавым па свайму функцыянальнаму прызначэнню. Па-першае, гэта быў акт пацвярджэння дзяўчынай-нявестай свайго дашлюбнага фізіялагічнага стану. Лічылася, калі «несумленная» нявеста ўтоіць свой грэх і сядзе на дзяжу, то гэтым учынкам апаганіць яе (дзяжу), за што будзе пакарана ўся сям'я: у бліжэйшыя сем гадоў не будзе радзіць хлеб, весціся жывёла, нараджацца дзеці. А рошчына ў дзяжы не будзе падымацца, адпаведна, хлеб увесь час будзе ацеслівым. Таму ў этнаграфічных крыніцах XIX ст. сустракаюцца апісанні, у якіх адзначаецца, што дачка падала перад бацькам на калені, прасіла прабачэння, але не садзілася на дзяжу. Зразумела, што ў гэтым выпадку далейшы ход вясельных падзей мог аказацца зусім непрадказальным. Мала таго, што нявеста-дачка зневажала бацьку, давала повад вёсцы пакпіць з усёй яе сям'і; гэты нечаканы факт ставіў у незразумелае становішча і сям'ю жаніха. Хоць часам здаралася, што пазбаўляў нявесту цнатлівасці якраз будучы жаніх.

Па-другое, дзяўчыну, якая яшчэ не зведала шчасце мацярынства, не нарадзіла дзіця, садзілі на той сакральны атрыбут сямейнага гаспадарання, які пастаянна сам «нараджаў» хлеб — сімвал жыцця. Замешанае цеста расло, уздымалася, хутка прыбывала ў памерах, таму сімвалічны кантакт дзяўчыны з рошчынай быў скіраваны на тое, каб перадаць ёй здольнасць зацяжарыць і прыбываць у вазе — «расці». Гэту найбольш пашыраную ў народнай культуры ўзаемасувязь, калі жанатая моладзь перадавала сваю здольнасць нарадзіць жытняй ніве, зямлі, а тая, у сваю чаргу, адорвала маладых шчасцем прадаўжэння роду — мы ўжо неаднаразова падкрэслівалі ў папярэдніх разважаннях і яшчэ шмат разоў будзем адзначаць далей.

Другім атрыбутам, які быў уключаны ў кантэкст выканання абраду пасаду нявесты на дзяжу, з'яўляўся вывернуты поўсцю наверх кажух. Гэта яшчэ адзін, здавалася б, будзённы прадмет хатняга ўжытку, які ў кантэксце вяселля раптам надзяляўся надзвычайным статусам і на працягу ўсёй святочнай цырымоніі станавіўся неад'емным атрыбутам-спадарожнікам маладых. На гэтым кажусе жаніх і нявеста будуць сядзець на працягу ўсяго вяселля, а таксама пад яго покрывам правядуць першую шлюбную ноч. У стыхіі вясельнай міфатворчасці кажух — гэта не што іншае, як тое залатое руно, якое шукалі старадаўнія арганаўты. Гэта не толькі сімвал надзеі на будучы дабрабыт у сям'і, але найперш гэта сімвал Боскага патраніравання.

У сувязі з тым, што да самай недатыкальнай сямейнай рэліквіі — дзяжы — атрымлівалі доступ многія з аднавяскоўцаў, яе імкнуліся засцерагчы самымі адмысловымі абярэгамі. У дзяжу клалі хлеб з соллю, якія выконвалі ролю абярэга хатняга ачага.

У розных рэгіёнах гэты абрад маглі выконваць у розны час: нявесту садзілі на дзяжу, калі распляталі косы, калі апраналі галаўны ўбор, пры сустрэчы ў нядзелю пасля шлюбу, у панядзелак — пасля першай шлюбнай ночы.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**БЛАСЛАВЕННЕ НЯВЕСТЫ**

Пасля таго, як нявеста ўставала з «пасада», бацькі блаславілі яе на шлюб. Для гэтага сям'я збіралася за сталом. Бацькі станавіліся бліжэй да чырвонага кута, у процілеглым куце, каля парога, размяшчаліся сваты. Адзін з іх прасіў бацькоў блаславіць дачку:

*Дай, Божа, у добры час пачаць,*
*у злы — памаўчаць!*
*Родныя бацька і маці!*
*Станьце на пастаці,*
*Дайце блаславенне*
*свайму дзіцяці!*

Бацька хрысціў дачку абразом, хлебам-соллю і казаў: «Бог блаславіць і долю дасць. Блаславіць цябе хлебам, соллю, шчасцем, доляй і добрым здароўем, і не на адну гадзіну, а на век доўгі!»

Затым абраз ставілі ў чырвоны кут, хлеб клалі на стол. Пасля гэтага нявесту бласлаўляла маці і хросныя бацькі. Нарэшце бацька **апаясваў дачку** спецыяльным вясельным **ручніком** і **тройчы па сонцы абводзіў яе вакол стала.** Сімвалічны сэнс гэтага абраду заключаўся ў наступным. Шмат гадоў таму, калі ў сям'і толькі што нарадзілася дачка, **бабка-павітуха клала немаўля на** невялічкім кавалачку палатна на агульнасямейны **стол**, тым самым далучаючы нованароджанага да самага свяшчэннага месца ў хаце. Будучаму даросламу **члену сям'і выдзялялі месца за сталом**. Абводзячы тройчы дачку вакол стала, бацька выконваў **рытуал развітання яе з роднай хатай**, праводзіў у вясельную дарогу.

У некаторых рэгіёнах існаваў звычай, калі бацька, а за ім маці і ўсе бліжэйшыя сваякі, павінны былі тройчы цалаваць дачку праз стол і блаславіць словамі: «Няхай Бог блаславіць».

А тым часам сяброўкі нявесты рыхтаваліся да сустрэчы жаніха і яго дружыны.

**ВЫКУП НЯВЕСТЫ**

У структуры традыцыйнага вяселля выкуп нявесты быў адным з найбольш эмацыянальных момантаў, у якім выяўляліся шматлікія рысы нацыянальнага характару: павага да іншых і самапавага кожнага з бакоў, далікатнасць, вытанчанасць манер і дзелавітасць. У ім прысутнічалі характэрныя рысы беларускага кірмашу: аднаму боку трэба было як мага больш выгандляваць за незвычайны «тавар», другому — мудрагеліста збіць кошт да мінімуму. Разам з тым у выкупе нявесты выразна выяўлялася этнічная асаблівасць «атакаваць» процілеглы бок не паасобку, а талакой, гуртам. Адначасова кожны з бакоў мог звярнуцца і да «забароненых» прыёмаў: паспрабаваць зняважыць саперніка, закрануць яго за жывое, выкрыўшы ў скупасці і іншых адмоўных якасцях.

Відавочна, больш старажытнай традыцыяй з'яўляецца той варыянт, калі дружына жаніха павінна была выкупіць нявесту ў яе старэйшай сястры. Пазней (з часу, калі мужчына стаў «галавой» у сям'і) «гандлявацца» даводзілася з яе родным братам або хросным бацькам.

Часам жаніху прапаноўвалі пазнаць сваю нявесту сярод іншых дзяўчат, маглі вывесці жаніху «падстаўную» нявесту — пераапранутую ў нявесту старэнькую бабулю. Аднак пасля выяўлення падмены «баярка» («старэйшая шаферка») выводзіла тую, дзеля якой збіралася мноства гасцей, і пачынаўся непаўторны гандаль.

Абрад выкупу нявесты даволі часта ўспрымаўся гісторыкамі культуры і этнолагамі далёкім водгукам найстаражытнейшай традыцыі сапраўднага продажу дзяўчыны ў чужую сям'ю або род. Пісьмовыя крыніцы сведчаць пра тое, што ў многіх народаў свету рытуальны акт куплі-продажу існаваў на самай справе. Аднак у дачыненні да беларускага варыянту выкупу неабходна зрабіць пэўныя ўдакладненні. Калі дружына маладога купляла «тавар», то навошта трэба было двойчы прапаноўваць заведама падстаўную фігуру? Адказ на гэта важнае пытанне можа даць толькі параўнальны аналіз тыпова блізкіх абрадавых сітуацый, а таксама аналагічных кантэкстаў, з якімі мы сустракаемся ў іншых жанрах фальклору. Першае, што неабходна ўзгадаць, — гэта безліч казачных сітуацый, у якіх пастаўленая перад героем задача канчаткова вырашаецца толькі за трэцім разам. Другое — мы ўжо ўзгадвалі, што ў сялянскіх сем'ях існавала правіла аддаваць дачок замуж у адпаведнасці з узростам, таму імкнуліся першнаперш «падставіць» старэйшую — баяліся, каб у «дзеўках не засядзелася». Трэцяе, у тых самых казках трэцяя, малодшая, дачка лічылася самай прыгожай і самай мудрай. Яна здольна была не толькі адгадаць мудрагелістыя загадкі, але і выканаць, здавалася б, зусім нерэальныя справы. Якраз таму і выбірала дружына жаніха трэцюю «кандыдатуру» нявесты як самую сапраўдную.

Калі абодва бакі былі задаволены «гандлем», выкуп завяршаўся, жаніх браў нявесту за руку і вёў яе ў бацькоўскую хату. Там за шчодрым на пачастункі сталом родныя нявесты ўжо чакалі гасцей. Дружына маладога садзілася за стол уздоўж сцяны ад вуліцы (таму што былі гасцямі ў гэтай хаце), а родныя нявесты — уздоўж сцяны ад двара (таму што былі ў гэтай хаце гаспадарамі). Старэйшы сват даваў каманду наліць па чарцы і выказваў пажаданне: «Вып'ем, каб было весела гуляць і наша вяселле доўгія гады не забываць!».

***(Працяг будзе.)***

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## POSTfactum

### 90-ГАДОВЫ ІНДЫЕЦ — САМЫ СТАРЫ БАЦЬКА Ў СВЕЦЕ

**Жыхар Індыі Нану Рам Йогі стаў самым старым бацькам у свеце. Як паведамляе газета «Таймс», жонка нарадзіла 90-гадоваму мужу 21-е па ліку дзіця.**

Паводле слоў самога Нану, ён не памятае, колькі ўсяго ў яго было дзяцей ад чатырох жонак: «прыблізна 12 сыноў і 9 дачок. І, прынамсі, 20 унукаў». Апошняя жонка індыйца, якая нарадзіла яму семярых дзяцей, была жонкай яго старэйшага сына, які загінуў дзесяць гадоў таму.

Нану Рам Йогі атрымаў званне найстарэйшага бацькі ў свеце пасля смерці аўстралійца Лес Калея, у якога апошняе дзіця нарадзілася ў 92 гады.

### ШАТЛАНДСКІХ СПАРТСМЕНАЎ СТРАХУЮЦЬ АД НАПАДУ... ЛОХНЕСКАЙ ПАЧВАРЫ



**Арганізатары спаборніцтваў па дуатлону ў Шатландыі прынялі рашэнне застрахаваць спартсменаў ад магчымага нападу лохнескай пачвары на 1 млн фунтаў стэрлінгаў (амаль 2 млн долараў), — паведаміла агенцтва AFP.**

Адна з мясцовых страхавых кампаній паабяцала выплаціць грошы ў тым выпадку, калі пачвара выплыве з возера і нападзе на каго-небудзь з удзельнікаў спаборніцтваў. Кіраўнік кампаніі Джон Вудмэн заявіў, што гэта — самая незвычайная страхоўка, на якую згадзілася яго фірма. Любыя праявы дзеянняў пачвары павінны быць даказаны незалежнай экспертызай ва ўстаноўленыя тэрміны. Спаборніцтвы запланаваныя на 2 верасня гэтага года на беразе легендарнага возера Лох-Нес на поўначы Шатландыі. Кожнаму з удзельнікаў трэба будзе прабегчы 10 кіламетраў і праехаць на веласіпедзе 20 км.

### КОЖНЫ ЧАЦВЁРТЫ АМЕРЫКАНЕЦ ЗА ГОД НЕ ПРАЧЫТАЎ НІВОДНАЙ КНІГІ



**Гэта пацвердзіла апытанне, праведзенае па заказу інфармагенцтва Associated Press. Як высветлілася, больш за ўсіх з амерыканцаў чытаюць жанчыны і пенсіянеры, а самымі папулярнымі напрамкамі ў літаратуры сталі рэлігійныя творы і любоўныя раманы.**

Найбольш чытаюць жыхары паўднёвых штатаў. Складальнікі апытання таксама адзначаюць, што людзі, якія наведваюць царкоўныя службы, чытаюць у сярэднім у два разы менш. Адрозніваюцца амерыканцы і па палітычных перакананнях. Так, прыхільнікі Дэмакратычнай партыі чытаюць больш за тых, хто прытрымліваецца рэспубліканскіх поглядаў.

Дарэчы, за апошні год агульная выручка прадпрыемстваў, што спецыялізуюцца на продажы літаратуры, склала 36 млрд долараў, усяго ў Штатах было прададзена 3,1 млрд кніг.

Тым часам быў развенчаны міф аб тым, што расіяне — самая чытаючая нацыя ў свеце. Згодна з аналагічным даследаваннем, больш як 30 працэнтаў дарослых расіян наогул не чытаюць кніг. Больш як 50 працэнтаў кніг ніколі не купляе. Актыўнымі чытачамі сябе назвалі толькі 23 працэнты жыхароў Расіі.

### ТАКОЕ СТРАШНАЕ АНГЛІЙСКАЕ КАФЭ...

**Кафэ Tea Cosy Rooms у англійскім горадзе Брайтан лічыцца самай страшнай установай ва ўсёй акрузе. Яе ўладальніка назвалі Фашыстам, а каб выпіць кубачак кавы і не быць пры гэтым са скандалам выстаўленым за дзверы, трэба выконваць шэраг устаноўленых гаспадаром строгіх правілаў.**

Уладальнік чайной Дэвід Дэлі беражэ прэстыж сваёй установы як зрэнку вока, пры гэтым вызначаецца вельмі крутым норавам. У гэтым ужо паспелі пераканацца некаторыя наведвальнікі, якія «пасмелі» акунуць у кубачак з чаем сваё пячэнне ці паставіць локці на стол. За такія «непрыстойныя» дзеянні яны былі выгнаны з кафэ з парадай у наступны раз строга выконваць правілы этыкету.



Сярод іншых правілаў, якія ўстанавіў у сваім кафэ Дэвід Дэлі, — не зневажаць каралеву, не піць чай з лыжачкі, не размаўляць па мабільным тэлефоне і наогул не павышаць голас у час гутаркі. У яго кафэ забараняецца таксама гучна смяяцца. «Людзі павінны выконваць правілы. Калі яны гэтага не робяць, то абавязаны пакінуць кафэ. Мы прапаноўваем сапраўднае мастацтва піцця чаю, а не проста кубкі з напоем, як у звычайнай забягалаўцы», — тлумачыць 30-гадовы ўладальнік установы.

Паводле слоў містэра Дэлі, у жыцці ён зусім не такі строгі, як на працы, і ўжо тым больш — не фашыст. Тым не менш, мясцовыя жыхары называюць ягонае кафэ «самым страшным месцам», якое яны калі-небудзь бачылі, а група энтузіястаў нават стварыла ў Інтэрнэце сайт, прысвечаны незвычайнаму кафэ. Чуткі і незвычайная рэклама, тым часам, прыносяць гаспадару немалыя барышы — многія турысты, даведаўшыся пра незвычайную ўстанову, спецыяльна заязджаюць у гарадок, каб пабываць у гэтым кафэ.

## Анталогія беларускай песні

# Песня пра Мінск

**Песні нараджаюцца з любові. І нясуць любоў, прасвятленне.**

**Гэтае трапяткое пачуццё паяднала імкненні творцаў Пімена Панчанкі і Ігара Лучанка, калі яны сумесна працавалі над песняй для радыёспектакля па рамане «Мінскі напрамак» Івана Мележа. І яна загучала як прызнанне — даверлівa, шчыра, спавядальна. З прыкметнай душэўнай цеплынёй Віктар Вуячыч вылучыў даверлівы характар вакальнага твора, распавёў і пра мужнасць, і пра братэрскую згуртаванасць, і пра духоўнае адзінства... А мелодыя песні стала музычным сімвалам мінчан, душою курантаў Мінскай ратушы.**

**Міхась ШАВЫРКІН.**

*Песня пра Мінск*

Верш Пімена Панчанкі Музыка Ігара Лучанка



*У дні бяды і ў ранак Перамогі,*
*У дні, калі ты харашэў і рос,*
*Усе твае надзеі і трывогі*
*Я ў сэрцы нёс, я ў сэрцы нёс.*

***Прыпеў:***
*Мой родны Мінск,*
*Пад небам жураўліным*
*Жыві, квітней пад*
*зоркай залатой.*
*Ты для мяне на ўсёй зямлі*
*адзіны,*
*Цябе люблю*
*я ўсёй душой.*

*Я да цябе з усіх дарог вярнуся,*
*Мая тут партызанская сям'я.*
*Ты мне прабач,*
*калі я зажурыся*
*Ля Вечнага, ля Вечнага агня.*

***Прыпеў.***

*Спакойнае дзяцей*
*тваіх дыханне.*
*Шумі над іх калыскамі ліствой.*
*Маё ты ранне і маё каханне*
*І вечар сіні-сіні мой.*

***Прыпеў.***

# «...І шчаслівей за ўсіх на свеце Не той, хто жне, а той, хто сее»

**25 ЖНІЎНЯ БЕЛАРУСКАМУ ПАЭТУ ПЕТРУСЮ МАКАЛЮ СПОЎНІЛАСЯ Б 75 ГАДОЎ.**

**Пятрусь Макаль нарадзіўся ў вёсцы Крушыняны на Беласточчыне (цяпер тэрыторыя Польшчы). Скончыў Гродзенскі педагагічны інстытут і Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве. Друкавацца пачаў з 1949 года.**



Паэзіі Петруся Макаля ўласцівы метафарычна-асацыятыўная вобразнасць, алегарычнасць, выкарыстанне сродкаў іроніі і сатыры. Аўтар кнігі паэзіі «Першы след», «Вятрам насустрач», «Вечны агонь», «Круглы стол», «Акно», «Дотык да зямлі» і іншых. Паэт выдаў таксама кнігу вершаў для дзяцей «Хлопчык будзіць сонца». Пятрусь Макаль вядомы і як драматург. Ён аўтар п'ес «За лясамі дрымучымі» (з А. Вольскім), «Дай вады, калодзеж!», «На ўсіх адна бяда» і іншых. На беларускую мову пераклаў творы рускіх, украінскіх, польскіх, чэшскіх паэтаў. У яго перакладзе выдадзена анталогія сучаснай славацкай паэзіі «Татры пяюць». Пятрусь Макаль — лаўрэат Літаратурнай прэміі імя А. Куляшова за зборнік «Поле», Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Янкі Купалы за кнігу паэзіі «Смак яблыка». Паэта не стала ў 1996 годзе.

**Уладзя ТАЦЦЯНЧЫК.**

* * *

**Пятрусь Макаль**

*У травы*
*Забіраюць правы —*
*Хіба гэта не бачыце вы?*
*Аграмады няўмольных будоў*
*Выцясняюць траву з гарадоў.*
*Рэчка чорная ўдаль плыве*
*Па траве, па траве, па траве...*
*Пашырае ўладанні свае —*
*І няма берагоў у яе.*
*І кладзецца сцяблінка травы*
*Пад асфальт, як*
*пад танк — радавы.*
*І здаецца, па дзірване*
*Перагрэты прайшоўся прас.*
*І зубром згаладнелым мне*
*Зарычаць падмывае падчас.*
*На душы — каменнем туга,*
*Бо мурожнага астраўка*
*Не знаходзіць мая нага,*
*Не знаходзіць мая рука.*
*Я хвалююся, як і вы,*
*Нахіляючы галаву:*
*У травы*
*Забіраюць правы...*
*Заступіцеся за траву!*

1970

* * *

*— Вы адкуль?*
*— Мы — ад куль.*
*Мы — з вайны.*
*Мы — званы.*
*Мы — дамы.*
*Мы — дымы.*
*Каміны.*
*Камяні.*
*Стукае боль у грудзі,*
*Ваўчыцай завея вые.*
*Ходзяць па свеце людзі,*
*Нібы званы жывыя.*

*Бухаюць зноўку і зноўку*
*У спёку, у дождж, у замець,*
*Торгае за вяроўку*
*Памяць*
*— Мы — званы.*
*Мы — з вайны.*

1976

***РОДНАЕ СЛОВА***

*Калі я засмягну ад спёкі,*
*дазволь мне табе пакланіцца,*
*крыніца —*
*роднае слова...*
*Калі заблуджуся ў дарозе,*
*не моўкні ў бацькоў на парозе,*
*цябе я здалёку пачую,*
*матчына слова.*
*Калі анямею раптоўна —*
*дык не навекі! —*
*голас мне вернуць не лекі,*
*а крэўнае слова.*
*Хай нават аглушыць бітва,*
*адновіць мой слых не малітва,*
*а бацькава слова.*
*Калі растваруся ў натоўпе,*
*дзе твару твар не знаходзіць,*
*аблічча маё адродзіць*
*айчыннае слова.*
*Лёсу майго кірунак,*
*долі маёй выснова,*
*як паратунак, —*
*матчына слова,*
*бацькава слова,*
*роднае вечнае слова!*

1984

## Inter-ПОЛ

### У ТУРМУ — СА СВАІМ БЫКОМ

**З-за свайго гаспадара ў турме прыйдзецца сядзець яго жывёліне — быку. Начальства сербскай турмы пасля доўгіх угавораў дазволіла мужчыне, які прыгавораны да турэмнага зняволення, узяць буйную рагатую жывёліну з сабой.**

54-гадовы сельскі жыхар Хамдыя Д'юік атрымаў год пазбаўлення волі за бойку. Калі ж даведаўся, што яму так доўга давядзецца знаходзіцца за кратамі, то стаў прасіць начальства турмы ўзяць з сабой быка па мянушцы Міко, да якога моцна прывязаўся. Як паведаміў Д'юік, акрамя яго аб жывёліне абсалютна няма каму паклапаціцца, а значыць, яе адправяць на бойню. Дзіўна, але гэта прычына падалася турэмнаму начальству дастаткова важкай, і Д'юіку дазволілі ўзяць быка вагой у паўтары тоны з сабой пры ўмове, што ён будзе добра сябе паводзіць. Акрамя таго, для яго нават выдзелілі асобную камеру на першым паверсе. Было паабяцана вызваліць дзіўную парачку да Калядаў, калі іх паводзіны не будуць выклікаць прэтэнзій.

### ПІР ДЛЯ АРЫШТАВАНАГА

**Нямала клопатаў прынёс паліцыі індыйскага штата Калькута злодзей, які ўкраў дарагія каралі, якія затым праглынуў. Увесь вечар паліцэйскім давялося наладжваць сапраўдны пір арыштаванаму, каб каштоўнасць як мага хутчэй выйшла з яго арганізма натуральным шляхам.**

Індыец Шэйх Мосін быў затрыманы пасля таго, як сарваў у магазіне цацак з жанчыны каралі коштам больш за тысячу долараў. Заўважыўшы праследаванне паліцыі, ён праглынуў каштоўнасць. Затрыманаму зрабілі рэнтген, які паказаў, што каралі знаходзяцца ў яго страўніку, пасля чаго вартаўнікам парадку прыйшлося дзейнічаць даволі незвычайнымі метадамі. Спачатку Шэйх пад прыглядам паліцыі з'еў 50 бананаў. Аднак прайшло дастаткова часу без жадаемага выніку. Тады паліцэйскія прынеслі арыштанту талерку рысу, курыцу і мясцовы хлеб, таксама прымусіўшы ўсё гэта з'есці. Толькі тады яны дабіліся свайго і атрымалі назад каралі.

### РУЖОВАЕ КАЦЯНЯ ДАСЦЬ АДЧУЦЬ ВІНУ

**Недысцыплінаваных тайландскіх паліцэйскіх прымусяць насіць на рукавах формы адлюстраванне кацяняці Hello Kitti, якое дзякуючы свайму яркаму колеру, звычайна ружоваму, вельмі папулярнае ў дзяўчынак.**

Увесці такое пакаранне ў якасці выхаваўчай меры для сваіх супрацоўнікаў кіраўніцтва паліцыі Тайланда вырашыла пасля таго, як высветлілася, што звычайныя дысцыплінарныя спагнанні, напрыклад, вымова, не дзейнічаюць на злосных парушальнікаў статута. Цяпер за дробныя правіннасці, напрыклад, за грубыя адносіны да грамадзян, паліцэйскі на працягу дня будзе насіць на рукаве павязку з ружовым кацянём. Паліцэйскае кіраўніцтва сцвярджае, што падобная мера павінна абудзіць у парушальнікаў дысцыпліны пачуццё віны. У тым выпадку, калі нават гэта павязка не падзейнічае і супрацоўнік паліцыі зноў учыніць правапарушэнне, то яго лёс будзе вырашаць дысцыплінарны камітэт, які можа часова заключыць яго пад варту.

**Падрыхтаваў Ігар РЫГОРАЎ.**

### ПАБАГАЦЕЎ НА ПРЫВАТЫЗАЦЫІ

**Індывідуальны прадпрымальнік з Салігорска падазраецца ў тым, што нагрэў рукі на падмане сваіх землякоў.**

Паводле звестак аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, прайдзісвет летам—восенню 2005 года аказваў пасрэдніцкія паслугі салігорцам па прыватызацыі і продажы жылля. Аднак 47-гадовы мужчына быў, як высветлілася, не зусім шчырым са сваімі кліентамі. Наадварот, махлярскім шляхам яму ўдалося завалодаць 20 млн рублёў пацярпелых. У адносінах да дзялка ўзбуджана крымінальная справа.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## Ведай нашых!

### ЗАЛАТЫ НАШ СЯМІКЛАСНІК

**Размова пойдзе пра вучня шматпрофільнай гімназіі № 56 г. Гомеля Генадзя Караткевіча, які, можна сказаць, здзіўляе ўвесь свет. Што маецца на ўвазе? Гэты сямікласнік раз-пораз робіць выклік навучэнцам з розных краін, старэйшым за яго на 2—4 гады, якія ўдзельнічаюць у міжнародных алімпіядах па інфарматыцы.**

Так, на мінулагодняй алімпіядзе ён, самы юны ўдзельнік, заваяваў сярэбраны медаль, а на сёлетняй, што гэтымі днямі закончылася ў Харватыі, — залаты. У гэтым плане ён памяняўся ролямі са сваім земляком Уладзімірам Міняйлавым, выпускніком Гомельскага абласнога ліцэя, які на мінулагодняй міжнароднай алімпіядзе па інфарматыцы быў першым, а на сёлетняй стаў другім.

Настаўнік гэтых таленавітых юнакоў — выдатны гомельскі педагог Міхаіл Сямёнавіч Далінскі, які рыхтуе беларускую каманду да міжнародных алімпіяд па інфарматыцы.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

## Тэлесеткі

### ЦІ БУДУЦЬ НА «ФАБРЫЦЫ ЗОРАК-7» БЕЛАРУСЫ?

Чакаць адказу на гэта пытанне засталося не так доўга. У тэлеэфір АНТ запускаецца новы канвеер паўфабрыкатаў. Музычным прадзюсарам шоў будзе кампазітар Канстанцін Меладзе. Вядучай па традыцыі — Яна Чурыкава, але ў яе, магчыма, з'явіцца памочнік. У зорным доме размесціцца 16 талентаў. Фармат праграмы крыху зменіцца. Плануецца, што ўдзельнікі будуць самі зарабляць сабе на харчаванне. Сярод 23 кандыдатаў ёсць дзве мінчанкі. Калі яны трапяць на «Фабрыку зорак-7», вы адразу даведаецеся іх прозвішчы.

**Ірына АНАТАВА.**

## На конкурс апавяданняў

***Дзе сёння жыве наша слова і дзе, непадробнае і мілагучнае, яго можна пачуць — як усё роўна ўбачыць? Ды там, пэўна, дзе і заўсёды: адкуль яно выйшла і пайшло па свеце. Толькі каб уведаць гэта, трэба самому ў тых мясцінах жыць, мець слых і зрок на гэта жыццё слова ў словах. І каму як не «раёншчыку» — журналісту раённай газеты — гэта найбольш дадзена... І таму зусім невыпадкова да «Залатога пяра» — прэміі Саюза журналістаў — Анатоль Бігайдараў далучыў прэмію конкурсу апавяданняў газеты «Звязда» за 2005 год.***

**Віктар КАЗЬКО.**

*«Жыццё заключаецца ў тым, што яно знікае».*

*Андрэй Платонаў*

# ПРАВІЛІХА

Пасля смерці гаспадара старая Правіліха жыла адна. Не захацелася ёй цясніць адзіную дачку Алеську. Тая, гаротніца, каторы ўжо год з мужам і двума дзеткамі-школьнікамі тулілася ў гомсельмашаўскай маласямейцы.

Залетась да Правіліхі разоў колькі наязджаў нейкі прыблуда: казаў, што з Веткаўскага раёна. Увішны дзядок-стараабрадзец доўга прыглядваўся. Да хаты-пяцісценкі, да гародчыка. Крэкчучы ад асалоды, часта прыкладваўся да глечыка з казіным сырадоем, мацаў-калупаў бярвенні ў адным з вянцоў banькі... Бабка не ўтрывалася — прагнала кандыдата ў прымакі. Відаць, не глянуўся.

— Ат, добра мецьмуся і саменькая! — бадзёра плямкала бяззубым ротам Правіліха ў адказ на роспыты дапытлівых кабет. — Ногі вунь пакуль соўкаюцца, рукі кій трымаюць... Калі што-якое, то і дачка падможа. Зяцёк, дзякуй яму, штовесну дровамі забяспечвае, ды і газ ёсць. А гарод я і сама неяк уладкую. Ці многа мне муж, зямля яму пухам, дапамагаў? Ён усе дні на рыбалцы бавіў, як стаў пенсіянерам. Такі ж і ў маладыя гады быў: камандзіроўкі, камандзіроўкі...

— Цяжка адной, не дзеўка ж! Можа козак сваіх надумала прадаваць? Хаця б адну?

— Не, адчапіцеся! — рашуча адмахвалася Правіліха. Адчувалася, што для сябе яна ўжо даўно адказала на гэтае няпростае пытанне. — Шкада мне і Машку, і Белку. Напачатку хацела збыць каторую з іх: пастуху менш плаціла б, ды і сена на адну нарабіць прасцей... Толькі каго выпраўляць з сяліцьбы? Абедзвюх люблю. Сярожка, зяцёк, не пярэчыў: «Пракормім, мамо! Затое малыя будуць з малаком і тварагом». Яно і праўда. Дачнікі, зноў жа, штораніцу веснiцы рвуць: любяць, гарадскія, казінае малачко! Гэтым бальзамам, кажуць, хоць душу маж. Вось бы вочкі мае ад малачка папраўліся — не бачу ў прыцемках нічога, ды і ўдзень ужо не намнога лепш.

На дрэнны зрок і слых Правіліха скардзілася даўно, яшчэ задоўга да смерці мужа. Зяць, праўда, звазіў яе да доктара, і нават акуляры справіў. Але гадоў праз пяць бабка зноў бачыла дрэнна. Урач, праўда, і папярэджваў, што праз пэўны час шкельцы ў акулярах трэба будзе памяняць на мацнейшыя. Ды нельга сёння на цэлы дзень пакідаць гаспадарку! Вось свет настаў — ні палажы, ні пастаў...

— Учора надвячоркам Людка-паштарка пенсію прынесла, — расказвала Правіліха бліжэйшай суседцы Веры. — Дык, мая ты харошая, мая ты любенькая, паверыш, не пабачыла нават, дзе распісвацца трэба. Людка маёю рукою вадзіла. Я ж, калі цямнее, зусім не бачу...

Правіліха з дзявоцтва была ці не лепшай на вёсцы гародніцай. Не было для яе працы больш жаданай і цікавай. Прыязджала з Гомеля, дзе рабіла тынкоўшчыцай на будоўлі, і хутчэй на гарод. Пасля спехам рыхтавала вячэру і зноў на свае градкі. Выхадных чакала так, як перасохлая глеба дажджу. Затое і радзіла на яе гародзе ўсё: і морква, і гуркі, і памідоры, і рэпка, і часнок, і буракі, і гарбузы. Адзін год асобныя гарбузы ўдвох з мужам заносілі ў хату. Такія ладныя ўдаліся.

— Ты, мусіць, нештачкі такое ведаеш, калі ў цябе і тапарышча карані пускае? — віселі на плоце цікаўныя вяскоўкі. — Падзяліся сакрэтам, варажбітка!

Правіліха разгінала спіну і рабіла так, як некалі вучыла маці: хавала рукі пад пярэднік і жвавенька круціла дулі — каб не сурочылі. Адказвала ж «зычліўкам» задзірліва, са смехам:

— У цябе, Таццянка, за ўсё лецейка адзін толькі пуз і загарае, а ў мяне — і твар, і рукі, і ногі, як у тае негры... А ты, Маня, зірні на свае ручкі! Кіпцюры адгадавала большыя, чым у майго Барсіка. Ды яшчэ і адзалочваюць на сонцы! З імі, вядомая справа, на градках рабіць няма чаго... І вы яшчэ пра нейкія сакрэты выпытваеце! Працуй, нябожа, то і Бог паможа — вось вам увесь мой сказ.

Правіліха не здраджвала даўняй звычцы: уставала за паўгадзіны да ўсходу сонца і, не зважаючы на расу, выходзіла на свае соткі. Калі дзеда не стала, раніцою печку не паліла. Сабе апоўдні, калі дужа прыпякала сонца і на гародчыку было не ўстаяць, варыла на газу які крупнік ці бульбу. Так і жыла.

— Ідзіце ўжо спаць, цётка Правіліха, — выпраўляла старую з памідорнай грады чуллівая суседка Вера. — Сонца ўжо даўно схавалася за лес!

— Вось падвяжу яшчэ тры калівы і пайду... Мне, Верка, і без святла бачна — я навобмацак... Гэта ж не палоць...

Неяк раз, здаецца, пасля Іллі, калі цыбулю падзёргалі ўжо (яна падсыхала на сонейку), Правіліха корпалася на гародзе. Хадзіла па разорах і зрывала ў кошык стручкі бобу і фасолі. Бабка прытамілася: струкоў было многа. Яна ўжо аднесла на дзяружку, раскінутую пад яблыняй, чатыры паўнюткія кошыкі. Кожны раз, праходзячы паўз вялікую граду морквы, Правіліха галасна шугала коз, якія, відаць, збеглі ад пастуха Ваські-пацалуйчыка. «Вось жа недарэка, а не чалавек, гэты Васька, — мармытала сабе пад нос бабка. — Вучоны, кажуць, спецыяліст па зорках, касманаўтаў бачыў жывых, ды з-за гарэлкі адлучылі яго і ад зорак, і ад коцмасу. Коз пасе, бейбус. Ды і таго не можа — вунь зноў паразбягаліся па гародах!»

Правіліха, спакваля ўзгадаўшы паходжанне пастуховай мянушкі, міжволі ўсміхнулася: умеюць жа нашы людзі перахрысціць! Васька даўно ўжо тут. Як не ўдалося там, дзе касманаўтаў запускаюць, сюды і вярнуўся, да бацькоў. Ён па натуры рахманы, памяркоўны, нават калі і «браў за каўнер». Словам, «анцілягент». Ніколі па-мужыцку не мацюкаўся! Вось хіба што ўсялякаму, хто найбольш насядаў на яго, «выпісваў камандзіроўку» кшталту «А пацалуйце вы мяне...» Так і стаў «пацалуйчыкам».

— А каб вас пранцы паелі! — кінуўшы кош са струкамі, Правіліха, як падбітая качка, патупала ў бок коз, якія ўжо, не зважаючы на гаспадыню, смела бадзяліся ля град з агуркамі і памідорамі. — Не столькі з'ядуць, колькі нападгрызваюць. Ці ж я вам мала штовечар жаўтлякоў кладу? Вам бы шкоды нарабіць!

«Няма каго папрасіць адагнаць козак на пашу, — мармытала Правіліха. — Верка, як на тое ліха, у Гомель падалася — да брата, і акуляры мне, казала, прывязе... Мне ж самой з Белкай і Машкай не ўправіцца...»

Пакуль бабка прычэпала да грады з памідорамі, козы некуды зніклі. Ды не надоўга!

Да вечара Правіліха сядзела на дзярузе пад раскідзістай яблыняй і борсценька церабіла сабраныя струкі. На коз, якія перайшлі на бурачны клін, а затым — на граду, дзе сохла выбраная цыбуля, бабуля ўжо не крычала: «Бацвінне бурачнае ешце — вунь як яно буяе. А што да цыбулі, то не ваш гэта ласунак, не паясце!»

— Добры вечар, цётка Правіліха! — павіталася Верка, якая вярнулася з горада. — Прывезла вам новыя акуляры. Прымерце! Гляджу, што вы і без іх упраўляецеся спрытней за мяне, маладую. Вунь колькі за дзень работы перарабілі! І паверыць цяжка!..

— Вой, Верачка, не смейся! Якая з мяне ўжо работніца. Усё больш навобмацак і з кіёчкам. Нават коз не змагла з агарода выправіць — паўдня тут са мною ў хованкі прагулялі. Я ж усяго і зрабіла, што фасольку сабрала і пацерабіла, ды і то не ўсю. Вазьмі вось паўмеха сабе, пацярэбіш, а мне і гэтай хопіць...

— А хто ж агуркі, памідоры абабраў? Хто пакапаў і знёс добрых паўграды буракоў і ўсю граду морквы? І цыбульку, гляджу, ужо знеслі? Во, і гарбузоў паменшала! Маглі б, цёця, і зяця з дачкой пачакаць — усё лягчэй. Не беражэце вы сябе!

...Правіліха доўга не магла ўцяміць: за што гэта Верка так яе нахвальвае? Калі ж зірнула на свае соткі праз шкельцы новых акуляраў, то... Суседка хацела «хуткую дапамогу» выклікаць: спаіла старой увесь флакон валяр'янкі.

— Людзечкі добрыя, ды што ж гэта робіцца? Гэта ж як Мамай пакіёўдзіў па полю! Усё чыста пазносілі!.. Сярод белага дня... На маіх вачах... А каб на іх немач! Каб на іх хвароба чорная! Бессаромныя!.. Усю вясну, усё лета гаравала... — Правіліха доўга не супакойвалася, усё кляла і прыгалошвала, як па нябожчыку.

***

Дзён праз колькі, калі прыехалі зяць, унукі, дачка, Правіліха ўжо не стагнала, не плакала. Сябе ўпікала: за немач, за нездагадлівасць, за неразваротлівасць. Маўляў, прыбрала б гародніну хутчэй, то і зладзеям не было б спакусы.

— А я, дочачка, дарэмна грашыла на белых маіх козачак, на Ваську-пацалуйчыка! Хто ж мог падумаць, што ў мяне пад саменькім носам зладзеі хадзілі? Старая я качка, сляпая кутніца! Так мне і трэба! Навука! Каму расказаць, дык памруць са смеху...

...Узгадваючы той выпадак, вяскоўцы казалі, што бачылі ля хаты Правіліхі, пад самым плотам, невялікі грузавічок. Бачылі і людзей, якія вольна хадзілі з рыдлёўкамі і мяшкамі па гародчыку. Ну, думалі, што гэта зяць, дачка і вадзіцель дапамагаюць старой — падмога прыбыла з Гомеля. «І цябе, Правіліха, бачылі, — хаваючы ўсмешкі, зазначалі бабы. — Сядзіш пасярод сваіх сотак ля кучы фасолі, цярэбіш яе. А заадно паглядаеш на доўгачаканых гасцей, раздаеш свае загады. Словам, перагукваешся з імі!»

**Анатоль БІГАЙДАРАЎ,**
*г. Ветка.*

